

ПРАВІЛЫ ГУЛЬНІ З АДХОДАМІ

8

«НЕ ДАЗВОЛЬЦЕ ВАЙНЕ ПАЎТАРЫЦЦА»

11



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

20 ЛІПЕНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 136 (29505)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«Нягледзячы на негатыўныя знешнія фактары, Беларусь мае пазітыўныя вынікі на экспартным напрамку за мінулы перыяд 2021 года. Так, можна гаварыць пра тое, што базавыя ўмовы мінулага года з'яўляюцца нізкімі, і прыводзіць нейкія іншыя прычыны і фактары, але, тым не менш, нам удалося сёлета забяспечыць істотны рост экспарту. За пяць месяцаў гэтага года беларускі экспарт тавараў і паслуг склаў больш як $18 млрд і павялічыўся амаль на 33 % да аналагічнага перыяду мінулага года. У выніку перавышэння экспарту (тэмп росту — 132,7 %) над імпартам (128,7 %) сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі склалася дадатнае ў памеры $1,25 млрд і палепшылася практычна на $700 млн. Гэта нядрэнны вынік, і нам неабходна забяспечыць захаванне гэтай тэндэнцыі, нягледзячы на ўсе складанасці, з якімі мы сутыкаемся, і санкцыйнымі, і іншымі».*

## КОРАТКА

- У Беларусі ў першым паўгоддзі пабудавалі 23,9 тыс. кватэр.
- **«Лінія жыцця і смерці»: выстаўка аб Мінскім гета адкрыецца ў музеі гісторыі ВАВ 20 ліпеня.**
- Гісторыкі БДУ выявілі прадметы бытавой культуры сярэдзіны І—пачатку ІІ тысячагоддзя н.э.
- **Вустрыцы паставілі пад пагрозу алімпійскую рэгату: малюскі асталяваліся ў Такійскім заліве.**

ISSN 1990 — 763X

# Хлебаробчы настрой



Фота БелТА.

**Жніво пачалося і на ўсходзе краіны. Аднымі з першых у Магілёўскім раёне выбарачную ўборку збожжавых распачалі ў аддзяленні «Гуслішча» ЗАТ «Сервалюкс-Агра». Настрой у камбайнера Дзмітрыя НОВІКАВА выдатны — значыць, і работа будзе спорыцца.**

## БЫВАЙ, «СЛАВЯНСКІ БАЗАР»! АБАВЯЗКОВА СУСТРЭНЕМСЯ ЗНОЎ!

**Учора ў сталіцы Падзвіння прагучалі апошнія акорды XXX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Карэспандэнт «Звязды» расказвае пра самыя яскравыя эпізоды фэсту.**

СТАР. 4



Фота БелТА.

Тэхналогіі

## ЭЛЕКТРАТРАНСПАРТУ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

### Ці будзе ў нас масавая вытворчасць экалагічных машын

**У Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень» маштабна адзначылі Дзень электратранспарту. Скутары, самакаты, а таксама аўтамабілі і аўтобусы на электрычным ходу — не проста сродак перамяшчэння, а транспарт заўтрашняга дня. Пераход на экалагічна чыстыя машыны дазволіць знізіць негатыўны ўплыў на прыроду. Пра свой намер адмовіцца ад выпуску аўтамабіляў з рухавіком унутранага згарання ўжо абвясцілі найбуйнейшыя аўтамабільныя канцэрны. І наша краіна не застаецца ўбаку. Курс на экалогію падтрымліваецца на самым высокім узроўні.**

СТАР. 7




Фота Сяргея КУРКАЧА.

З першых вуснаў

# «ЯК ПРЭЗІДЭНТ ГЭТАГА НАРОДА Я ПАВІНЕН РАБІЦЬ ПЭЎНЫЯ КРОКІ, КАБ КРАІНУ НЕ ЗНІШЧЫЛІ»

## Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю тэлеканалу Sky News Arabia

**У якасці інтэрв'юера выступіў галоўны рэдактар навін канала Імада аль-Атраш. Ён браў інтэрв'ю ў шэрагу вядомых палітычных і рэлігійных дзеячаў, уключаючы Папу Рымскага Францыска, прэм'ер-міністра Італіі Сільвія Берлусконі, прэзідэнта Еўракамісіі Рамана Продзі. Тэлеканал Sky News Arabia — арабамоўны, кругласутачны навінавы канал, перадачы якога транслююцца ў асноўным на Блізкі Усход і на Паўночную Афрыку. Штаб-кватэра Sky News Arabia размешчана ў свабоднай медыязоне Абу-Дабі.**

Размова кіраўніка дзяржавы з журналістам Імад аль-Атрашам працягвалася каля гадзіны. Яе асноўнымі тэмамі сталі экстранная пасадка самалёта Ryanair, адносіны з Захадам і ўплыў санкцый на беларускую эканоміку. Журналіста таксама цікавіла пытанне нелегальнай міграцыі і абвінавачванні ў адрас Беларусі. Таксама Імад аль-Атраш пацікавіўся, ці плануе Беларусь удзяльнічаць у чарговай сесіі Генеральнай асамблеі ААН.

### «МЫ СПАКОЙНА РАЗВІВАЕМСЯ»

Адказваючы на пытанне аб тым, як санкцыі паўплывалі на Беларусь, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што санкцыі — непрыемная справа для любой краіны. «Мы разумелі, што рана ці позна гэтыя санкцыі будуць уведзены супраць нашых асобных людзей, паўтары ці дзвюх соцень людзей, сапраўдных патрыётаў, якія кіруюць краінай і абараняюць яе. І супраць асноўных прадпрыемстваў. Для чаго? Для таго, каб разбурыць эканоміку. Мы гэтага чакалі і рыхтаваліся да гэтага», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў увагу, што санкцыі не перашкодзілі развіццю краіны і росту эканомікі. Па яго словах, у выніку санкцый за першае паўгоддзе гэтага года прырост валавога ўнутранага прадукту ў Беларусі склаў 3,5 працэнта. Гэта больш, чым планавалася летась.

«Яны ўвялі санкцыі супраць нашых прадпрыемстваў, але прадукцыю гэтых беларускіх прадпрыемстваў яны даўно на свой рынак не пускаюць. Вось і ўся дэмакратыя і міжнародны гандаль. Мы супрацоўнічаем і з вашым рэгіёнам, з Цэнтральнай Азіяй, галоўны наш партнёр — Расія. Таму мы спакойна развіваемся, глядзім, якую гадасць яны яшчэ могуць нам падкінуць, і рыхтуемся да гэтага. Але пакуль плюс 3,5 % ВУП», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

### ПАТРЭБНА БУДЗЕ ДАПАМОГА — МЫ ЯЕ АКАЖАМ

Імад аль-Атраш папрасіў беларускага лідара пракаментаваць абвінавачванні ў адрас Беларусі ў спрыянні нелегальнай міграцыі ў Еўропу. На гэта Аляксандр Лукашэнка адказаў, што калі яны (літоўцы, палякі, немцы або французы) хочуць схаваць ісціну, то можна папракаць Беларусь у датычнасці да міграцыі. Ён параіў тым, хто хоча па-сапраўднаму змагацца супраць нелегальнай міграцыі і ўвесці яе ў нармальнае рэчышча, пачынаць з сябе.

«Мы групоўкі людзей злачыннага характару ў Літве бачым. Мы бачым. А чаму яны гэтага не бачаць? Як толькі яны ліквідуюць гэтыя групоўкі, якія за грошы прывозяць у Літву нелегальных мігрантаў, нелегальная міграцыя ў Літву будзе ніжэйшая, чым у мінулым годзе, адзінкі будуць. Хай пачынаюць працаваць, калі ім патрэбна будзе дапамога — мы гэтую дапамогу ім акажам, але не бязвыплатна ўжо», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі прывёў яшчэ адзін аргумент. «Яны ўвялі супраць нас санкцыі, яны пайшлі на ўдушэнне маёй краіны, на ўдушэнне майго народа. Як Прэзідэнт гэтага народа я павінен, ацэньваючы сітуацыю, рабіць пэўныя крокі, каб народ не ўдушылі, каб краіну не знішчылі. Прадпрымаючы супраць беларускага народа падобныя дзеянні, яны хочуць, каб мы іх абаранялі ў гэтай сітуацыі. Па меншай меры гэта дзіўна. Калі зыходзіць з чыста прагматычных пазіцый, гэта каштуе вялізных грошай. Работа на граніцы і абарона ад наркотыкаў, нелегальных паставак зброі, нелегальнай міграцыі — гэта велізарныя грошы. Калі вы хочаце, каб мы вам дапамагалі, дык не накідвайце нам на шыю пятлю», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### ❍ КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

### «МАЯ ЗАДАЧА — ЗАДАВАЦЬ ПЫТАННІ І АТРЫМЛІВАЦЬ НА ІХ АДКАЗЫ»

Пасля інтэрв'ю з Прэзідэнтам Беларусі Імад аль-Атраш падзяліўся сваімі ўражаннямі з беларускімі калегамі.

«Я хацеў бы адзначыць, што падзеі, якія адбываюцца ў Беларусі, цікавыя не толькі для гледачоў у нашай краіне. Наш канал вяшчае на шэраг дзяржаў, таму ўвесь свет і тэлегледачы ў розных краінах цікавяцца тым, што адбываецца ў вашай краіне, паколькі гэта міжнародны парадак дня.



Фота БелТА.

Усе пытанні, якія я накіраваў беларускаму боку пры падрыхтоўцы да інтэрв'ю, усе яны былі захаваныя. Тыя пытанні, якія датычыліся ўнутранай абстаноўкі ў Беларусі, затрымання Рамана Пратасевіча — усе яны былі зададзены кіраўніку дзяржавы, і я атрымаў адказы на іх», — сказаў Імад аль-Атраш.

Меркаванне

# У ІНТАРЭСАХ НАРОДА

**Трапляюцца і сярод заходніх аналітыкаў спецыялісты з аб'ектыўнымі крытэрыямі ацэнкі. І тады іх заява гучыць досыць нечакана для многіх калег, якія практыкуюць адпрацоўку палітычнага заказу накont падзей, звязаных з нашай краінай.**

Адзін з прыкладаў — погляд на дзяржаўную палітыку Беларусі і палітычны феномен А. Лукашэнкі news-front.info выказаў аўстрыйскі палітычны аналітык Патрык Попель. «Заходнія СМІ называюць яго «апошнім дыктатарам Еўропы», але, магчыма, варта аб'ектыўна зірнуць на цяперашнюю сітуацыю ў краіне і дзеянні Прэзідэнта. Заходнія дзяржавы спрабуюць аказаць уплыў, каб перацягнуць Рэспубліку (Беларусь) на свой бок. Для гэтага выкарыстоўваюцца брудныя стратэгіі. Як дзяржаўны дзеяч А. Лукашэнка павінен абараняць свой народ і інтарэсы дзяржавы ад гэтых уплываў. Нават у дэбатах аб перадачы бежанцаў ён дзейнічае ў інтарэсах народа. Чаму ён павінен трымаць у Беларусі бежанцаў, якія страцілі свае дамы ў Афганістане, Паўночнай Афрыцы або на Блізкім Усходзе з-за ўмяшання Захаду? А. Лукашэнка ведае, што масавая міграцыя прыносіць толькі сацыяльныя праблемы і злачыннасць, таму тут ён відавочна дзейнічае ў інтарэсах свайго народа. І гэтыя паводзіны не знаходзяць разумення на Захадзе, паколькі ў Еўропе ўжо шмат гадоў не хапае такіх палітыкаў. Для мяне А. Лукашэнка — апошні моцны дзяржаўны дзеяч Еўропы», — заўважыў Патрык Попель.

Падобнае меркаванне агучыў у эфіры радыёстанцыі «Вести FM. Москва» расійскі паліталог Сяргей Міхееў: «З Прэзідэнта Беларусі А. Лукашэнкі можна браць прыклад іншым лідарам краін, паколькі ён вельмі хутка адказвае ўдарам на ўдар». Пагадзіцеся, аб'ектыўныя ацэнкі прыкметныя сярод інфармацыйнай лухты. Таму што праўда — самы надзейны крытэрый.

**Пётр ДУНЬКО.**

Блізкая ўлада

# ПРА МОСТ, ДАРОГІ І НЕ ТОЛЬКІ

**На прамую лінію з кіраўніком выканаўчай улады Гродзеншчыны звярнулася каля 80 чалавек**

**Усе пытанні ўзятыя на кантроль. Некаторыя звароты задавальняліся непасрэдна падчас гутаркі. Па найбольш праблемных пытаннях вызначаны адказныя асобы і тэрміны выканання.**



Фота БелТА.

Усяго за тры гадзіны прамой тэлефоннай сувязі да **старшыні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Уладзіміра КАРАНІКА** звярнулася каля 80 чалавек. Большасць з іх — жыхары абласнога цэнтра. Як правіла, многія пытанні датычыліся работы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Такіх зваротаў было больш за 40. Таксама былі пытанні па тэме аховы здароўя, гандлі, транспартным забеспячэнні.

Бадай што самая злабадзённая тэма — добраўпарадкаванне, у асноўным, рамонт дарог. На іх стан звярталі ўвагу як гродзенцы, так і жыхары раёнаў. Напрыклад, жыхар Ваўкавыскага раёна папрасіў разгледзець пытанне па асфальтаванні дарогі паміж вёскамі Шаўкі і Дыхнавічы. Ад жыхароў абласнога цэнтра паступіла інфармацыя пра нездавальняючы стан дарог па вуліцах Лізы Чайкінай, Млынарнай, Урублеўскага.

Жыхарка Гродна папрасіла патлумачыць, чаму дом, які пастаўлены на капітальны рамонт, не будзе праходзіць цеплавую мадэрнізацыю. У выніку размовы са спецыялістамі, якія дзяжурылі на прамой лініі, жанчына атрымала ўсе неабходныя па гэтым пытанні каментарыі. Яшчэ адна жыхарка Бярозаўкі Лідскага раёна прасіла дапамогі ў працаўладкаванні.

У зваротах была закранута і тэма якаснага водазабеспячэння. У прыватнасці, такая праблема непакоіць жыхароў вёскі Каробчыцы Гродзенскага раёна. А вось жыхары абласнога цэнтра папрасілі разгледзець работу ГЦ «Фолюш» і абмежаваць продаж алкагольных напояў у начны час.

Некаторых грамадзян цікавілі пытанні, якія датычацца каранціну пасля прыезду з-за мяжы. Былі і словы падзякі. Іх гродзенец выказаў кіраўніку рэгіёна за тую ўвагу, якая аддаецца развіццю спорту.

Увечары таго ж дня ў Гродне планавалася ўрачыстае адкрыццё новага моста праз Нёман. Але з-за моцнай залевы мерапрыемства перанесена на больш позні тэрмін. Як паведаміў журналістам Уладзімір Каранік, у выніку амаль трапічнага ліўня мост атрымаў сур'ёзныя пашкоджанні. Гэта здарылася з-за вялікай нагрузкі на ліўневую каналізацыю, да таго ж адхоны яшчэ не зараслі травой і больш схільныя да размывання. Дарэчы, такая сітуацыя адбываецца другі раз за два тыдні.

Між тым, кіраўнік рэгіёна адзначыў, што рашэнні, якія былі прынятыя мінулым разам па мадэрнізацыі ліўнёўкі, дазволілі справіцца з патокам вады і пазбегнуць пашкоджання дарожнага палатна. Што наконт адхонаў — яны разлічаны на дождж, які бывае раз у 20 гадоў, але сёлетняя залева аказалася больш інтэнсіўная і трэба быць гатовымі да такіх ападкаў. Мяркуецца, што на аднаўленне моста спатрэбіцца каля тыдня і столькі ж на праектныя работы па перахопе вады.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Дзеля памяці

# Згасла зорка легенды

**На 84-м годзе жыцця памёр народны артыст Беларусі, кампазітар Андрэй Мдзівані.**



Жыццёвы шлях Андрэя Юр'евіча пачаўся 1 кастрычніка 1937 года ў Тбілісі, рос ён у сям'і грузінскіх інтэлігентаў. Спачатку былі вучоба ў музычнай школе па класе скрыпкі і фартэпіяна і баўленне вольнага часу за праслухоўваннем класікі. А калі будучаму маэстра споўнілася 15 гадоў, яго маці накіравалі працаваць у Беларусь. Пасля вучобы ў школе ў Віцебску Андрэй Мдзівані скончыў спачатку Смаленскае музычнае вучылішча, потым Беларускую кансерваторыю.

За гады жыцця Андрэй Юр'евіч не толькі стаў аўтарам шматлікіх сімфоній, музычна-тэатральных твораў, канцэртаў і сімфанічных паэм, харавых і вакальных цыклаў, музыкі да спектакляў, але і працаваў як выкладчык у Мінскім музычным вучылішчы (з 1969 года) і Беларускай кансерваторыі (з 1992 года), дзе з 1993 года з'яўляўся прафесарам кафедры кампазіцыі. Талент майстра быў адзначаны шэрагам узнагарод, сярод якіх Дзяржаўная прэмія БССР за Пятую («Памяць зямлі») і Шостую (Полацкія пісьмёны») сімфоніі, яе кампазітар атрымаў у 1988 годзе. А ў 1996 годзе яго ўзнагародзілі Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь за балет «Жарсці (Рагнеда)», які быў пастаўлены на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра Беларусі.

Таксама Андрэй Мдзівані быў лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (яго ўзнагародзілі за оперу «Маленькі прынц»). У 2013 годзе атрымаў званне народнага артыста Беларусі...

Смерць здарылася пасля інсульту. Пахаванне адбудзецца на Усходніх могілках у сераду 21 ліпеня, дзе таксама можна будзе развітацца з легендарным кампазітарам.

**Спачуванні родным і блізкім маэстра даслаў кіраўнік дзяржавы: «Творчасць майстра застанецца ў айчыннай культуры сапраўдным прыкладам высокага прафесіяналізму, арыенцірам для многіх пакаленняў беларускіх кампазітараў. У нашых сэрцах назаўсёды захавaецца светлая памяць пра Андрэя Юр'евіча, які прысвяціў сваё жыццё самааддана служэнню мастацтву і Радзіме».**

Здарэнні

# Выстрал з мінулага

## У Смалявіцкім раёне прадпрымальнік вывез мужчыну ў лес і забіў яго выстралам у галаву

**Амаль чвэрць стагоддзя прайшло, як ва ўжытак трывала ўвайшоў выраз «ліхія 90-я» — час у многім страшны і дзіўны. Спартыўнага выгляду хлопцы ў скураных куртках і спартыўных штанах чынілі баль на абсягах некалі вялікай краіны, пранікшы ва ўсе сферы жыцця, жорстка ліквідуючы любыя перашкоды на сваім шляху. Часы сёння іншыя, але зрэдку тое мінулае дае аб сабе знаць...**

...Раніцай 7 ліпеня 35-гадовая жыхарка вёскі Волма Смалявіцкага раёна выявіла, што дома няма яе 44-гадовага мужа. Жанчына звярнулася ў праваахоўныя органы. Следча-аператыўная група, якая прыбыла па выкліку, правяла агляд дома з выкарыстаннем магчымасцяў перасоўнай крыміналістычнай лабараторыі. Плямы крыві, раскіданыя рэчы і мэбля сведчылі аб тым, што там адбыўся канфлікт.

Работу на месцы здарэння, як паведаміла **афіцыйны прадстаўнік УСК па Мінскай вобласці Алена КРУПЕНІНА,** каардынаваў начальнік упраўлення Следчага камітэта па Мінскай вобласці Андрэй Ліс. Пры аглядзе прылеглай да дома тэрыторыі таксама былі выяўлены сляды крыві. Раскапаўшы зямлю ў лесапаласе непадалёк, следчыя выявілі цела зніклага мужчыны. У вобласці галавы ў яго мелася агнястрэльнае раненне.

Пры правядзенні першапачатковых следчых і працэсуальных дзеянняў устаноўлена, што незадоўга да таго ў пацярпелага на глебе асабістых непрыязных адносін адбыўся канфлікт з мясцовым 40-гадовым індывідуальным прадпрымальнікам. Мужчына нават звяртаўся ў праваахоўныя органы з заявай аб прыцягненні бізнесмена да адказнасці. Апошні ж, з'яўляючыся заўзятым паляўнічым, ведаў, што прыцягненне да адказнасці пагражала яму адабраннем зброі і пазбаўленнем права на паляванне. З гэтай прычыны ён прасіў цяпер ужо загінулага адмовіцца ад прэтэнзій і нават пагражаў яму.

Як устаноўлена следствам, у купальскую ноч, з 6 на 7 ліпеня, індывідуальны прадпрымальнік набыў алкагольныя напоі і з трыма знаёмымі паехаў дадому да свайго апанента «вырашаць праблему». Пры ўжыванні спіртнога паміж мужчынамі зноў узнік канфлікт, падчас якога гаспадар дома быў збіты. Пасля таго, раніцай 7 ліпеня, мужчыны селі ў аўтамабіль і паехалі па дарозе ў бок лесу. Там машына спынілася, працаўнікі выйшлі з аўто, але літаральна праз хвіліну індывідуальны прадпрымальнік падышоў да аўтамабіля, схапіў карабін, які захоўваўся там, і стрэліў у галаву свайму апаненту.

Далей, па інфармацыі следства, ён даручыў аднаму са знаёмых адцягнуць цела загінулага ў лесапаласу і закапаць яго. Аўтамабіль з пырскамі крыві быў вымыты на СТА. Пасля зламыснік паспрабаваў пакінуць тэрыторыю краіны, рушыўшы ў напрамку Расійскай Федэрацыі. Аднак і сам ён, і яго знаёмыя былі аператыўна затрыманыя супрацоўнікамі міліцыі.

Следчымі 40-гадоваму мужчыну прад'яўлена абвінавачанне па артыкуле «забойства, здзейсненае групай асоб» Крымінальнага кодэкса. Абвінавачаны затрыманы і знаходзіцца ў следчым ізалятары.

Расследаванне крымінальнай справы даручана следчай групе з ліку вопытных супрацоўнікаў следчага ўпраўлення УСК па Мінскай вобласці. Бізнесмен і яго знаёмыя дапытаныя, з іх удзелам праведзены праверкі паказанняў на месцы, вочныя стаўкі. Прызначана правядзенне шэрагу экспертных даследаванняў. Дапытваюцца сведкі. У найбліжэйшы час па выніках расследавання будзе дадзена канчатковая прававая ацэнка дзеянням усіх фігурантаў дадзенай справы.

**Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ.**

# ВЫПАДАК НА ВОЗЕРЫ СВЯТОЕ

**Спецыялісты Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах Гомельскай вобласці працягваюць праверку па факце надзвычайнага здарэння на возеры Святое на Рагачоўшчыне. Свае паказанні даў кіроўца прагулачнага катара, якога спачатку не маглі адшукаць на месцы здарэння.**



Мужчыну абвінавачваюць у тым, што ён самавольна ажыццявіў эксплуатацыю катара і дапусціў знаходжанне на палубе судна 14 чалавек пры дапушчальнай колькасці — 6 пасажыраў + 2 чалавекі экіпажа. Як адзначылі ў Гомельскім абласным упраўленні МНС, сваю адсутнасць на месцы здарэння кіроўца катара растлумачыў тым, што выплыў далёка ад месца перакульвання судна, заблукаў у прыбярэжнай зоне, бо знаходзіўся ў эмацыянальна ўзрушаным стане. Мужчына сам прыйшоў да супрацоўнікаў МНС і спецыялістаў Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах Гомельскай вобласці, якія на той момант распачалі праверку па факце надзвычайнага здарэння на вадаёме.

— У адрас кіроўцы катара на дадзены момант складзены адміністрацыйны пратакол за парушэнне патрабаванняў бяспечнай эксплуатацыі маламернага судна — перагрузку катара, — адзначыла **афіцыйны прадстаўнік Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Ксенія ШЫНГІРЭЙ.** — Цяпер працягваецца высвятленне абставін перакульвання катара. Разглядаецца таксама версія прычыны здарэння — парушэнне патрабаванняў бяспекі пры манеўраванні суднам на вадзе.

Як паведамлялася ў СМІ, 16 ліпеня ў 21.18 ратавальнікам паступіла паведамленне аб перакульванні прагулачнага катара на возеры Святое каля вёскі Стрэнькі Рагачоўскага раёна. У вадзе — у 70—80 метрах ад берага — апынуліся 15 чалавек. Работнікамі МНС былі выратаваны пяць чалавек — трое дарослых і двое дзяцей. Ніхто з іх не пацярпеў. Астатнія пасажыры катара да прыбыцця ратавальнікаў самастойна даплылі да берага.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

**Фота Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС.**

Будзьце пільныя!

# НАСТУПСТВЫ НЕПАГАДЗІ,

## або Як сябе паводзіць падчас навальніцы

**Надвор'е ў мінулыя выхадныя кідалася ў крайнасці. То пякло так, што хвацца ад сонца ці каля якога вадаёма ратавацца. То потым залівала, грымела, неба рассякала маланка. На жаль, не абышлося без трагедый...**

Калі пачалася навальніца, кампанія маладых людзей, якая адпачывала на возеры ў Стайках, што непадалёк ад Мінска, не прыдумала больш нічога, як схавацца пад вялізным разлапістым дубам. Яшчэ са школы мы ведаем, што калі бліскае маланка, стаяць пад дрэвамі катэгарычна забараняецца. Але маладыя людзі, відаць, забыліся пра элементарныя правілы бяспекі — у выніку ад удару маланкі ў дрэва загінула дзяўчына 1996 года нараджэння, чатыры маладыя чалавекі атрымалі моцныя электратраўмы, яны шпіталізаваныя.

Як паведамілі ў афіцыйным тэлеграм-канале Міністэрства аховы здароўя, стан пацярпелых ацэньваецца як сярэдне-цяжкі. «Урачы мінскіх бальніц, куды былі дастаўлены пацярпелыя, робяць усё магчымае, каб захаваць здароўе маладым людзям, — гаворыцца ў акаўнце Мінздароўя. — Урачы рыхтуюць іх да правядзення аператыўных умяшальніцтваў. Гэта будзе комплекс хірургічнага лячэння з выдаленнем пашкоджаных апёкамі тканак і з наступным правядзеннем пластыкі».

Па аператыўных даных МНС, у выніку праходжання навальнічнага фронту з парывамі ветру да 24 м/с пацярпеў 21 населены пункт у Гродзенскай і Мінскай абласцях. Пашкоджаны дахі сямі жылых дамоў і такой жа колькасці сельскагаспадарчых пабудоў. Зафіксаваны 49 выпадкаў падзення дрэў ва ўсіх рэгіёнах краіны, за выключэннем Віцебшчыны.

— Падчас навальніцы не размяшчайцеся побач з жалезабетонным палатном, каля вадаёму, вышыннага аб'екта без маланкаадводу, — нагадвае пра бяспечныя паводзіны падчас навальніцы **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Не дакранайцеся да паверхні ствалоў дрэў, металічных канструкцый. У зоне адноснай бяспекі займіце сухое месца на адлегласці 1,5—2 метры ад высокіх аб'ектаў: дрэва, апоры ліній электраперадачы. Не знаходзьцеся побач з уключанымі электрапрыборамі, праводкай, металічнымі прадметамі, не дакранайцеся да іх рукамі, не стойце паблізу маланкаахоўнага зазямлення.

З-за багатых ападкаў (усяго са тры гадзіны пры месячай норме 78 мм выпала 50,1 мм) у Гродне былі падтопленыя шэсць участкаў дарог. У Мінску затапіла пяць участкаў дарог, у выніку чаго рух быў спынены на 20 аўтобусных, 15 тралейбусных і 5 трамвайных маршрутах. Затрымка склала ад 17 хвілін да 3 гадзін 34 хвілін. Аператыўна работнікі МНС, а таксама іншых арганізацый адпампоўвалі ваду, распілоўвалі і прыбіралі дрэвы, якія ўпалі.

Па інфармацыі «Белэнерга», на працягу сутак на тэрыторыі краіны перыядычна парушалася энергазабеспячэнне ў 532 населеных пунктах. Непаладкі апертыўна ліквідавалі аварыйныя брыгады.

**Вераніка КАНЮТА.**

### КАЛІ НАВАЛЬНІЦА ЗАСТАЛА ВАС

**— У памяшканні.** У першую чаргу адключыце ўсе электрапрыборы і выцягніце штэкер вонкавай антэны з тэлевізара, спыніце тэлефонныя размовы. Паспрабуйце ліквідаваць скразнякі, шчыльна зачыніце вокны і коміны. Не размяшчайцеся каля акна, печы, масіўных металічных прадметаў, на даху і гарышчы.

**— На вуліцы.** Пакіньце адкрытую прастору і схавайцеся ў памяшканні або ў пад'ездзе любога дома. Калі вырашылі схавацца пад казырком будынка, не дакранайцеся да сцяны. Не карыстайцеся мабільным тэлефонам. Не стойце паблізу высокіх слупоў, рэкламных шчытоў і іншага.

**— У машыне.** Спыніце рух. Зачыніце вокны, апусціце антэну, заглушыце рухавік і перачакайце навальніцу ў салоне аўтамабіля. Не дакранайцеся да ручак дзвярэй і іншых металічных прадметаў. Не варта браць у рукі мабільны тэлефон.

**— У лесе.** Трымайцеся падалей ад высокіх дрэў, якія стаяць асобна. Не размяшчайцеся каля вогнішча: слуп гарачага паветра — добры праваднік электрычнасці. Часцей за ўсё маланка трапляе ў дубы, таполі і вязы, радзей — у бярозы і клёны. Уладкуйцеся паміж нізкарослымі дрэвамі з густымі кронамі. Выбіраючы сабе ўкрыццё, звярніце ўвагу, каб побач не было расшчэпленых дрэў, раней пашкоджаных навальніцай: маланка можа трапіць сюды яшчэ раз.

**— На адкрытай мясцовасці (у полі).** Не стойце на ўзвышшах, каля апор ліній электраперадачы і пад правадамі. Пашукайце яму або яр. Калі ніякіх заглыбленняў паблізу няма, прысядзьце як мага ніжэй ці ляжце на зямлю. Не хавайцеся ў стозе сена ці саломы, у закінутых адзіночных бараках ці хлявах. Не хадзіце басанож і не падымайце над галавой прадметы, якія праводзяць ток: рыдлёўкі, матыкі, косы.

**— На вадаёме.** Выйдзіце з вады, адыдзіце падалей ад берага, схавайцеся ва ўкрыцці. Калі вы знаходзіцеся ў лодцы, вяслуйце да берага. Калі гэта немагчыма, абсушыце лодку; калі ёсць ахоўны тэнт, падыміце яго; пры наяўнасці сухой вопраткі пераадзеньцеся; сядзьце падалей ад мачтаў і падкладзіце пад сябе ратавальную камізэльку або боты. Рыбалку падчас навальніцы неабходна спыніць: снасці з'яўляюцца праваднікам для электрычнасці.

### ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ЎДАРЫЛА МАЛАНКА

- хутка вызначце стан пацярпелага;
- неадкладна правядзіце рэанімацыйныя мерапрыемствы: штучнае дыханне, непрамы масаж сэрца;
- сагрэйце пацярпелага;
- апрацуйце месцы апёкаў і спадарожныя раны;
- дайце анальгін;
- тэрмінова дастаўце пацярпелага ў бальніцу.

Надвор'е

# Уначы ўсяго плюс восем

## Ці надоўга?

**Атмасферны фронт, які прынёс у ноч на панядзелак моцныя дажджы ў паўднёва-ўсходнюю частку нашай краіны, адсунуў гарачае надвор'е ў бок еўрапейскай тэрыторыі Расіі. Як той казаў, не было б тое, было б што другое, — і ў нашу краіну пачала паступаць паветраная маса з Балтыйскага мора. Пахаладае? Не зусім. На працягу гэтага тыдня захаваецца ўмерана цёплае надвор'е з тэмпературным фонам у асноўным у межах кліматычнай нормы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

А вось заўтра, у пачатку трэцяй дэкады, месцамі па краіне, а раніцай і ўдзень на большай частцы тэрыторыі Гродзенскай і Віцебскай абласцей пройдуць кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах магчымыя навальніцы. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 11 градусаў да 18 градусаў вышэй за нуль. Удзень будзе дастаткова камфортна — ад плюс 20 да 27 градусаў цяпла.

Далей, у чацвер і пятніцу, нас чакаюць свежыя ночы. Неба будзе чыстае, і паветра стане хутка астываць. У чацвер чакаецца пераважна без ападкаў. Вецер прагназуецца паўночна-заходні, паўночны ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 па поўначы да 16 градусаў вышэй за нуль па паўднёвым усходзе краіны. Удзень паветра будзе дастаткова хутка награвацца і стане ад 20 плюс да 26 градусаў.

Абсалютна свежае надвор'е чакаецца ў нас і ў пятніцу. Уначы будзе пераважна без ападкаў, а ўдзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ноччу складзе 8—15 градусаў вышэй за нуль, удзень — ад плюс 21 градуса да 28 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у выхадныя, пачынаючы з паўднёва-заходніх раёнаў краіны, вецер зноў памяняе напрамак з паўночна-заходняга, паўночнага на паўднёва-заходні і паўднёвы. А гэта значыць, што тэмпературны фон пачне павышацца і ў дзённыя гадзіны, па паўднёвым захадзе, паветра прагрэецца да плюс 30 градусаў і нават больш.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# БЫВАЙ, «СЛАВЯНСКІ БАЗАР»! АБАВЯЗКОВА СУСТРЭНЕМСЯ ЗНОЎ!

## ГРАН-ПРЫ — У КАЗАХСТАНА І ЧАРНАГОРЫІ

Самыя доўгачаканыя падзеі на кожным фестывалі — конкурсы маладых выканаўцаў эстраднай песні і дзіцячы вакальны.



**Перамога на конкурсе маладых выканаўцаў дасталася прадстаўніцы Казахстана РУХІІ.** Гран-пры ўручыў старшыня журы Анатолій Ярмоленка.

**А сярод маленькіх зорачак (якім ад 8 да 14 гадоў) Гран-пры заваяваў прадстаўнік Чарнагорыі Комнен ВУКАВІЧ.**

Арганізатары шмат разоў падкрэслівалі, што прыярытэт пры ацэнцы выступленняў аддаецца артыстам з добрымі вакальнымі данымі, харызмай, а не аматарам зрабіць шоу. Пераможцы гэтых конкурсаў з часам становяцца зоркамі. Напрыклад, беларуска Алёна Ланская, казахскі талент Дзімаш Кудайберген, украінка Таісія Павалій і іншыя. Нагадаем, што журы Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу ўзначаліў сербскі выканаўца Філіп Жмахер. Памеры Гран-пры — адпаведна 20 000 і 5 000 долараў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## СВЯТА СКОНЧЫЛАСЯ? ДЫ НЕ!

Цырымонія афіцыйнага закрыцця «Славянскага базару» адбылася 18 ліпеня.

Як і ў мінулыя гады, на гэты канцэрт, як і на адкрыццё фэсту, білеты раскупілі задоўга да старту падзеі. Дарэчы, пасля фінішу свята ў Віцебску працягнулася.

Па традыцыі наступны пасля афіцыйнага завяршэння «Базару» — так званы дадатковы дзень. І 19 ліпеня гараджане і госці працягвалі атрымліваць асалоду ад мастацтва, ад пакупак, ад адпачынку ў асаблівай атмасферы.

У прыватнасці, у панядзелак увечары у канцэртнай зале «Віцебск», якая адначасова ўмяшчае каля 1,2 тысячы гледачоў, адбыўся сольны канцэрт легендарнага спевака Мікалая Наскова. У 1987 годзе ён выканаў некалькі песень для мастацкага фільма «Востраў загінулых караблёў», многія палюбілі фільм і кампазіцыі. У тым жа годзе артыст быў запрошаны Стасам Наміным у групу «Парк Горкага» як вакаліст і франтмэн.

Ноччу на 20 ліпеня ў Летнім амфітэатры завяршыўся гала-канцэрт «Шансон ТБ — усе зоркі».

## МОЖА, МАЛА?

Афіцыйная частка юбілейнага форуму культуры доўжылася чатыры дні. У дырэкцыі фэсту мяркуюць, што гэтага дастаткова. Такой жа думкі прытрымліваюцца і старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай Шарснёў, і кіраўніцтва гарвыканкама. За трыццаць гадоў зроблена выснова, што зацягваць праграму не варта.

Калісьці «Славянскі базар» гасцяваў у Віцебску і ў эфірнай прасторы тэлебачання і радыё па паўтара тыдня і больш. Праз шэсцьсем дзён гараджане пачыналі стамляцца. Апошнія гады праект доўжыцца менш за тыдзень. І, бадай, гэта аптымальны тэрмін.

Яшчэ накont часу — сёлета цікавым падарункам ад мясцовай улады для ўсіх стаў гадзіннік на ратушы — сімвал горада, які нядаўна запусцілі пасля капітальнага рамонту.




Фота БелТА.

## ПАВІНШУЮЦЬ... МАТРОШКУ?

Надзвычайным здарэннем на фэсце стала раптоўная хвароба расіяніна Мікалая Баскава, які стаў лаўрэатам Спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення». Пра тое, што павысілася тэмпература, артыст паведаміў сам у адной з сацыяльных сетак. Яго імянная зорка на Плошчы лаўрэатаў каля амфітэатра залацістым васільком засіхацела сямнаццатая па ліку. На жаль, спявак не выступіў на канцэрце адкрыцця «Базару», як планавалася.

Расіяне ўражвалі шмат разоў: і на сцэнах, і ў музеях, і на выстаўках рамеснікаў. Напрыклад, своеасаблівай сенсацыяй сталі экспазіцыі «Таржок — жывая традыцыя залатой вышыўкі» і «Залатая хахлама — душа Расіі». Культура брацкай краіны прадстаўлена была багата.

У сваю чаргу, **Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі Дзмітрый МЕЗЕНЦАЎ** у размове з прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі шчыра дзяліўся ўражаннямі. Ён згодны са словамі кіраўніка беларускай дзяржавы, якія былі агучаны на цырымоніі адкрыцця фэсту, што тут у першую чаргу цэняць майстэрства ўдзельнікаў. Дзмітрыю Мезенцаву падабаюцца шчырасць віцебскага фестывалю і конкурсаў, сумленнасць і павага да гледача, клопат пра ўсіх, хто прыязджае на «Базар». Ужо абмяркоўваюцца праекты, якія ў будучым годзе будуць рэалізоўваць у рамках саюзнага супрацоўніцтва.

Сярод самых цікавых ідэй — святкаванне дня нараджэння... рускай матрошкі. У Віцебску, дзе працавалі заснавальнікі новага мастацтва, будзе вельмі цікава, калі матрошка стане авангарднай. Такую ідэю агучыў **старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** падчас круглага стала, прысвечанага юбілею фестывалю. Дыскусія адбылася ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава.

Дзмітрый Мезенцаў разам з **кіраўніком беларускага ўрада Раманам ГАЛОЎЧАНКАМ**, кіраўніцтвам абласной улады адкрывалі рух па вуліцы Гагарына. Там завяршылі капітальны рамонт, які правялі ў рэкордна кароткі тэрмін. Усё зрабілі прыкладна за год, што разы ў чатыры хутчэй, чым прадугледжана нарматывамі. Сакрэт — у зладжанай рабоце, часта на працягу круглых сутак. Сёлета — юбілей першага палёту ў космас, Гагарын нарадзіўся недалёка ад Віцебшчыны, на Смаленшчыне: гэта таксама яднае народы двух краін. Таму сімвалічна, што адкрыццё аб'екта стала міжнароднай акцыяй.



## МАЛАДЗЁЖНЫ ЗАПАЛ

Ёсць планы арганізаваць у 2022 годзе не адзін, а больш дзён Саюзнай дзяржавы на «Базары». І, вядома, будучыня за маладымі. Таму падтрымцы моладзі будзе аддавацца яшчэ большая ўвага.

Сёлета маштабна правялі Дзень моладзі ў рамках «Славянскага базару ў Віцебску». Дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы ўзяў актыўны ўдзел у канферэнцыі Міжнароднага саюза маладзёжных аб'яднанняў. Ён выказаўся накont магчымасцяў далейшага супрацоўніцтва паміж расіянамі і беларусамі, развіцця турызму, абмену вопытам у патрыятычным выхаванні. У прыватнасці, расіянам вельмі цікавы вопыт дзейнасці беларускай піянерскай арганізацыі.

У «базарным» Віцебску хлопцы і дзяўчаты падзяліліся сваімі энергіяй і талентамі падчас фестывалю «Запальвае моладзь», які ўпершыню стаў працягам традыцыйнага Дня моладзі.

Мелася шмат лакацый, дзе можна было пазнаёміцца з прадстаўнікамі субкультур, паназіраць за тым, як яны спяваюць, танцуюць, займаюцца рознымі відамі спорту.

Асаблівая прымета фэсту: ужо падчас самога фестывалю вядзецца падрыхтоўка да наступнага. Абавязкова дуэт — «Славянскі базар» і сам Віцебск у 2022-м — парадуе і здзівіць усіх ад малога да вялікага. У гэтым галоўны сакрэт 30-гадовага поспеху культурнага свята, якое аб'ядноўвае людзей розных нацыянальнасцяў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Краіны АПЕК і Расія дамовіліся павялічыць здабычу нафты



Краіны-вытворцы нафты пагадзіліся павялічыць сваю здабычу, каб знізіць цану на яе і аслабіць ціск на сусветную эканоміку. Краіны АПЕК і Расія пачнуць нарошчваць пастаўкі ўжо са жніўня. Рашэнне заклікана спыніць рост цэн на «чорнае золата» і бензін, выкліканы аднаўленнем эканомікі ў многіх краінах пасля крызісу, што пачаўся з пандэміяй каранавіруса. Нафта маркі Brent сёлета падаражэла на 43 працэнты — да амаль 74 долараў за барэль. Летась АПЕК і партнёры скарацілі здабычу на рэкордныя 10 мільёнаў барэляў у суткі на фоне спаду попыту і цэн, выкліканага пандэміяй. Аднак сёлета цана на нафту рэзка вырасла з-за аднаўлення эканамічнай актыўнасці, што спрыяла росту інфляцыі ў некаторых краінах і пагражала затармазіць аднаўленне сусветнай эканомікі. На сустрэчы 1 ліпеня міністры краін-нафтавытворцаў не змаглі дамовіцца аб аслабленні вытворчых абмежаванняў на перыяд да канца гэтага года. Рашэнне нарасціць са жніўня здабычу аказалася заблакіравана з-за рознагалоссяў паміж Саудаўскай Аравіяй і ААЭ. Пасля таго як афіцыйныя перагаворы зайшлі ў тупік, міністры працягнулі кансультацыі ў нефармальным рэжыме, яны доўжыліся два тыдні. А на экстраннай сустрэчы АПЕК і партнёры дамовіліся павялічыць пастаўкі на два мільёны барэляў у дзень са жніўня да снежня, каб дапамагчы стабілізаваць рынак нафты, дзе назіраецца дэфіцыт.

## У выніку перастрэлак у Чыкага забітыя 7 чалавек і больш за 50 паранена

Па меншай меры 7 чалавек загінулі і 55 атрымалі раненні ў выніку перастрэлак у Чыкага ў мінулыя выхадныя. Пра гэта паведаміў тэлеканал Fox News. Па даных газеты Chicago Sun-Times, на суботняй вечарынцы ў Чыкага было застрэлена шэсць чалавек, чацвёра з якіх былі падлеткамі. Пяць дзяўчат ва ўзросце ад 12 да 19 гадоў атрымалі раненні і былі шпіталізаваныя. Як паведамляе паліцыя, маладыя людзі стаялі на тратуары і размаўлялі, калі хтосьці з пазадарожніка, які праязджаў міма, адкрыў агонь па кампаніі. Інцыдэнт адбыўся менш чым праз суткі пасля таго, як у пятніцу вечарам здарыўся яшчэ адзін масавы расстрэл, у выніку якога адзін чалавек быў забіты і трое атрымалі раненні. У нядзелю ў выніку перастрэлкі былі параненыя 8-гадовы хлопчык і 28-гадовы мужчына. Агонь па машыне з пацярпелымі адкрыў чалавек у чорным пазадарожніку. Як паведамляе чыкагскі тэлеканал WBBM-TV, дзіця атрымала агнястрэльнае раненне ў левую нагу, а мужчына — у спіну. Паводле аналізу, праведзенага газетай Chicago Sun-Times, у Чыкага зарэгістраваны не менш чым 33 перастрэлкі, у выніку якіх пацярпелі чацвёра або больш чалавек.

## «Залатую пальмавую галіну» Канаў атрымаў французскі фільм «Тытан»



Галоўны прыз 74-га Канскага кінафестывалю — у псіхалагічнага трылера «Тытан» французскага рэжысёра Джуліі Дзюкорна. Гран-пры Канскага кінафестывалю, другую па значнасці ўзнагароду, атрымалі дзве карціны: іранскі фільм «Герой» рэжысёра Асгара Фархадзі і фільм «Купэ нумар 6» фінскага рэжысёра Юха Куасманена (сумесная вытворчасць Расіі, Фінляндыі, Эстоніі і Германіі). Узнагарода за найлепшую рэжысуру дасталася французу Ляосу Каракса. Яго мюзікл «Анэт» аб шлюбнай пары стэндап-коміка (Адам Драйвер) і опернай спявачкі (Марыён Катыяр) распачынаў праграму фестывалю 6 ліпеня і лічыўся адным з асноўных прэтэндэнтаў на галоўны прыз. Прыз журы дастаўся фільмам «Калена Ахед» ізраільскага рэжысёра Надава Лапіда і «Памяць» тайскага рэжысёра Апічатпонга Вірасетакула. «Залатую пальмавую галіну» як найлепшы акцёр атрымаў Калеб Лэндры Джонс, які сыграў у фільме «Нітра» рэжысёра Джасціна Курзеля. Рэната Рэйнсве атрымала ўзнагароду як найлепшая актрыса за ролю ў фільме «Найгоршы чалавек у свеце» нарвежца Іакіма Трыера. Прыз за найлепшы сцэнарый дастаўся карціне «Сядзь за руль маёй машыны» японскага рэжысёра Русукэ Хамагуі, знятай паводле апавядання Харукі Муракамі.

# БАБРУЙСК. «ВЫШЭЙ! ХУТЧЭЙ! МАЦНЕЙ!»

## Фестываль «Вытокі. Крок да Алімпу» прайшоў на Магілёўшчыне

**Падарожжа фестывалю культуры, мастацтва і спорту па краіне працягваецца. Спартыўна-масавае мерапрыемства «Вытокі. Крок да Алімпу» прайшло ў Магілёўскай вобласці, у горадзе, дзе вельмі любяць братоў нашых меншых, шанууюць свае карані і традыцыі, развіваюць спорт і мастацтва. Чарговае свята ў мінулыя выхадныя прымаў Бабруйск.**



У кожным горадзе праграма свята аднолькавая. Але дзякуючы адметнасцям беларускіх гарадоў, кожны раз фестываль праходзіць са сваім каларытам. У Бабруйску непаўторную атмасферу ствярала ўнікальная повязь багатага мінулага і насычанага цяперашняга.

### Цэнтр горада — наша багацце

У першы дзень фестывалю падчас круглага стала «Бабруйск. Традыцыі і сучаснасць» спецыялісты абмеркавалі развіццё турыстычнага патэнцыялу горада і сучасныя сродкі, якія ў гэтым дапамогуць. Сустрэча прайшла ў важным месцы — «Яўрэйскім дворыку». Некалі тут была сінагога XIX стагоддзя, у савецкі час — млын, да нашых дзён захаваліся толькі дзве сцяны з фабрычнай разенбергаўскай цэглы. Гэтыя сцены і сёння прыцягваюць яўрэяў, прычым не толькі з Бабруйска, але і з іншых гарадоў, у тым ліку не беларускіх. У 2015 годзе рабін Шауль Хабабо ініцыіраваў аднаўленне спадчыны тутэйшай яўрэйскай гарадской абшчыны.



Вітаючы ўдзельнікаў круглага стала, Шауль Хабабо падкрэсліў, што бабруйская сінагога адрозніваецца ад іншых акцэнтам на развіццё турызму. Па яго словах, не менш за 10 тысяч турыстаў у год наведвае бабруйскую сінагогу. «Мая мэта — азнаёміць людзей з культурай, традыцыямі яўрэяў. Мы жывём у адным горадзе, ходзім па адных вуліцах і павінны ведаць больш адно пра аднаго», — адзначыў рабін. Важна ўдакладніць, што ў Бабруйску ёсць працуючая сінагога, пабудаваная ў XVIII — пачатку XIX стагоддзя. Праўда, ад першапачатковай пабудовы засталіся толькі 200-гадовыя вокны. Але галоўнае, што мясцовым яўрэям ёсць дзе маліцца.

Дырэктар кампаніі «БелБрэнд-Аўдыт» Валянціна Дыніч звярнула ўвагу, што ў Бабруйск прыязджаюць не толькі людзі, якія раней тут жылі, а іх дзеці і ўнукі. «Як ім данесці, што гэта зямля, дзе жылі іх продкі? Мне здаецца, ніць паміж пакаленнямі становіцца больш тонкая. Дастаткова сказаць, што гэта радзіма продкаў, ці для прыцягнення новых людзей патрэбна шукаць новыя падыходы?», — пацікавілася яна. Праз сваё гістарычнае развіццё Бабруйск сёння можа стаць флагманам у развіцці настальгічнага турызму. Асабліва ў пандэмійныя часы, калі людзі сталі больш актыўна знаёміцца са сваёй краінай. І, як адзначыў Шауль Хабабо, новых шляхоў прыцягнення турыстаў ніколі не бывае шмат. Прыклад аднаго з іх — электронная карта Бабруйска з указаннем яго славутасцяў.

А паглядзець у горадзе сапраўды ёсць што. Бабруйск можа ганарыцца адметнай гарадской забудовай. Невялікія нізкія домікі дарэвалюцыйных часоў па сведчаннях спецыялістаў ёсць толькі ў Бабруйску і Пінску. «Цэнтр нашага горада — наша багацце. Мы можам гэтым ганарыцца. У нашых домікаў ёсць свая спецыфіка — турыст, які сам пойдзе гуляць па горадзе, шмат што можа не ўбачыць. Недзе не тую шыльду павесілі, сцены перафарбавалі, вокны замянілі. І я за тое, каб разам з турыстам хадзіў чалавек, які адкрые яму ўсю прыгажосць горада. У цэнтры сабраны нашы самыя цікавыя храмы — Свята-Георгіеўская царква, Свята-Мікольскі храм, касцёл. Да іх у людзей ёсць вялікая цікавасць. Асабліва ўражвае бабруйская спецыфіка прыбудоўваць да храмаў іншыя ўстановы. У мяне ёсць аўтарская экскурсія па горадзе «Яўрэйскі Бабруйск», я рабіў яе для бабруйчан, у першую чаргу. І сёння шмат мясцовых жыхароў прыходзіць на маю экскурсію», — падзяліўся **Алег КРАСНЫ, намеснік старшыні мясцовай яўрэйскай абшчыны, экскурсавод.**

### Людзі калекцыяніруюць уражанні

Настальгічны турызм, на які сёння робіць акцэнт Бабруйск, — гэта ў асноўным унутраны турызм. Таму прадстаўнікі галіны не забываюць пра беларусаў, якім цікавы Бабруйск. «У нас выдатная архітэктура, знакамітая бабруйская цэгла са сваёй рэцэптурай. Старадовыя домікі, якія выглядаюць, як быццам пабудаваны ўчора. Яны напоўнены гісторыяй. Людзям гэта вельмі падабаецца. Мы шмат думаем пра турыстаў з-за мяжы, але мне здаецца, што ў нас неўзараная цаліна нашых беларускіх турыстаў», — падкрэсліў Алег Красны.

Сёння ў Бабруйску ёсць усё, каб людзі сюды прыязджалі не на адзін дзень. Як заўважыў Алег Красны, гораду пашанцавала, што ён знаходзіцца недалёка ад Мінска. З іншага боку, праз гэта турысты часта праводзяць у горадзе адзін дзень і вяртаюцца ў Мінск. Таму, як упэўнены спецыяліст, варта актыўна працаваць над сучаснымі сродкамі прыцягнення гасцей горада. Самы лепшы сёння — сацыяльныя сеткі. «Цяпер людзі калекцыяніруюць не інфармацыю, а ўражанні. Яны абсалютна візуальныя, усё трэба ўбачыць на свае вочы. Таму варта не баяцца працаваць у сацыяльных сетках — неабходна ўсё расказаць, а яны прыедуць паглядзець», — заўважыў Алег Красны. Таксама ён падкрэсліў, што ўсім, хто мае дачыненне да турызму ў Бабруйску, варта аб'яднацца ў суполкі — гідам, рамеснікам, аграсядзібам. Стварэнне своеасаблівага бабруйскага залатога кола будзе цікавым праектам для гасцей і эканамічна выгадным для гаспадароў.

Яшчэ адзін спосаб прыцягнення ўвагі да Бабруйска — інтэрактыўныя экскурсіі. Асабліва тое актуальна для маладога пакалення. Прарцуе ў гэтым кірунку Бабруйскі краязнаўчы музей. **Старшы навуковы супрацоўнік музея Ксенія КІСЯЛЕВІЧ** расказала, што ў іх цэлы шэраг квэстаў, праходзячы якія, наведвальнікі музея знаёмяцца з яго экспазіцыяй і гісторыяй горада. Маладыя бабруйчане ў музеі ў незвычайнай форме могуць пазнаёміцца з яўрэйскай культурай. Інтэрактыўны занятак «У госці да хлопчыка Давіда» знаёміць моладзь з традыцыямі народа, лёс якога цесна звязаны з Бабруйскам.

### Усё для брэнда

Фестываль «Вытокі. Крок да Алімпу» мае на мэце прыцягненне ўвагі да рэгіёнаў, цікавых гарадоў. Нездарма арганізатары вырашылі праводзіць яго ў раённых цэнтрах, якія славяцца сваёй цікавай гісторыяй.

«Наша задача — яшчэ раз пераканацца, што кожны горад, кожны рэгіён мае сваю культуру, свае асаблівасці. Выкарыстоўваючы гэты патэнцыял рэгіёна, мы можам яго прасоўваць з карысцю для краіны. Пачынаць фестываль «Вытокі» лагічна менавіта з гісторыі, каранёў. На круглым стале мы робім акцэнт на тым, што яшчэ хацелася б зрабіць, каб мы самі сябе ведалі лепш. Тут сабраліся прадстаўнікі бізнесу, музеяў, грамадскіх арганізацый, навуковай грамадскасці. Гэта вельмі цікавая супольнасць. Нам трэба разумець, дзе мы недапрацоўваем. Пасля падобных абмеркаванняў мы фарміруем пэўную запісную кніжку. І я спадзяюся, што па выніках усіх фестываляў у нас будзе сустрэча, напрыклад, з кіраўніцтвам адпаведнай галіны, з актыўнымі прадстаўнікамі гэтай галіны на месцах. І разам будзем развіваць турыстычны брэнд нашай краіны ў цэлым і кожнага рэгіёна паасобку», — падкрэсліла Валянціна Дыніч.

Культуру і асаблівасці рэгіёна паказала і знакамітае прадпрыемства ААТ «Бабруйскаграмаш», якое стала экскурсійнай і дыялогавай пляцоўкай. На другі дзень свята тут прайшла экскурсія для арганізатараў фестывалю і журналістаў з розных куткоў краіны. Пасля экскурсіі спецыялісты правялі семінар «Распрацоўка і прасоўванне рэгіянальных і нацыянальных брэндаў» і культурна-эканамічны праект «Капітал мясціны». Пляцоўка для правядзення такіх мерапрыемстваў была абрана невыпадкова — сёння ў Беларусі актыўна развіваецца прамысловы турызм, які можа стаць адметным брэндам рэгіёна. У Бабруйску для гэтага ёсць усе ўмовы.

У яшчэ адным знакавым для Бабруйска месцы — Магілёўскім абласным тэатры драмы і камедыі імя В. Дуніна-Марцінкевіча абмяркоўвалі прасоўванне творчых і інавацыйных праектаў. Там прайшоў семінар «Маладзёжны брэнд». Як і ў кожным рэгіёне, маладыя гараджане прапаноўвалі крэатыўныя ідэі праектаў, што будуць яшчэ больш яскрава вылучаць іх родны рэгіён на карце краіны.

### Песня для фестывалю

Па традыцыі фестывалю «Вытокі. Крок да Алімпу» галоўныя падзеі разгарнуліся ў суботу — каля «Бабруйск-Арэны» прайшоў спартыўны квэст. Магілёўскі рэгіён устанавіў рэкорд для ўсяго свята — 28 спартыўных пляцовак. У гэты дзень кожны змог знайсці занятак даспадобы — адкрыць для сябе новыя віды спорту, паслухаць выдатную музыку, азнаёміцца з вырабамі мясцовых рамеснікаў.

«Фестываль ужо набраў абароты, кожны горад імкнецца здзівіць і прадставіць свае адметнасці. Думаю, Бабруйск з яго багатымі традыцыямі ў спорце, у вытворчасці, культуры пакажа ўсю сваю разнастайнасць. Тут гараджане заўсёды былі актыўныя і гасцінна прымалі гасцей. «Вытокі» — гэта нашы карані, наша спадчына, буду вельмі рады, калі гэты фестываль дапаможа нам выхаваць новае пакаленне беларусаў, якое беражліва б ставілася да сваіх вытокаў», — сказаў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ.**

А культурныя і спартыўныя традыцыі ў Бабруйска сапраўды багатыя. У горадзе вырасла плеяда чэмпіёнаў і прызёраў Алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы. Адзін з іх — Андрэй Багдановіч, чэмпіён Алімпіяды 2008 года ў веславанні на байдарках і каноэ, адкрыў свята ў суботу. Кампанію яму склаў вядомы беларускі спявак, таксама ўраджэнец Бабруйска Руслан Аляхно. У родным горадзе ён падарыў фестывалю «Вытокі. Крок да Алімпу» своеасаблівы гімн — прадставіў песню «Хутчэй! Вышэй! Мацней!», напісаную спецыяльна для фестывалю.

«Фестываль дае ўнікальную магчымасць для маладых выканаўцаў праявіць сябе і атрымаць пуцёўку на вялікую сцэну. Мы таксама вырашылі прыўнесці ў фэст нешта сваё і напісалі песню «Хутчэй! Вышэй! Мацней!». Гледачы пачулі яе падчас адкрыцця фестывалю. Спадзяюся, усім вельмі спадабалася», — пракаменціраваў падзею артыст.

На працягу некалькіх гадзін госці свята правяралі свае сілы ў баскетболе, цяжкай і лёгкай атлетыцы, хакеі, футболе, гімнастыцы і іншых відах спорту. Вялікай папулярнасцю карысталася пляцоўка стральбы з лука. Кожны ўдзельнік квэсту мог адчуць сябе Робін Гудам і на сабе праверыць асаблівасці алімпійскай дысцыпліны, у якой будуць спаборнічаць і беларускія спартсмены. Бабруйск славіцца сваёй школай барацьбы, таму цэнтрам прыцягнення ўвагі стала пляцоўка, дзе былі аб'яднаны ўсе віды адзінаборстваў. А пакуль аматары спорту праходзілі квэст, на галоўнай пляцоўцы адбываўся конкурс маладых спевакоў. У малодшай узроставай катэгорыі перамагла Аляксандра Цярпіла, у дарослай — Алена Цітова. У заключны дзень бабруйскага фестывалю на сцэне ўшанавалі пераможцаў конкурсу дзіцячага малюнка «Мой крок да Алімпу», які праходзіў у рамках выстаўкі «Кола часу». Выстаўка, арганізаваная галерэяй «АртХаос», адкрылася ў першы дзень і на працягу ўсяго фестывалю збірала аматараў сучаснага беларускага мастацтва.

Асноўная задача свята «Вытокі. Крок да Алімпу» — успомніць свае карані і паказаць сучасныя адметнасці рэгіёна. Бабруйск і ўся Магілёўская вобласць з гэтай задачай справіліся на «выдатна». Свой крок да Алімпу на мінулым тыдні зрабілі магілёўскі турызм, культура, мастацтва, спорт і кожны зацікаўлены ў развіцці роднага краю.

Цяпер чарга Салігорска, які прыме свята ўжо ў гэтыя выхадныя. Фестываль «Вытокі. Крок да Алімпу» ў Мінскай вобласці пройдзе 22—24 ліпеня і стане заключным рэгіянальным святам. А прыгожай кульмінацыяй гэтай летняй спартыўна-культурнай гісторыі стане грандыёзны фінал у Мінску ў канцы жніўня.

**Валерыя СЦЯЦКО,**
*г. Бабруйск.*
**Фота НАК Беларусі.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| Продавец | **ОАО «КУПАЛИНКА», Минская обл., г. Солигорск, ул. Заслонова, 58** |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1. Здание бокса гаражей** (здание специализированное автомобильного транспорта), инв. № 644/С-59172, общ. пл. 138 кв. м. Ограничения / обременения: аренда.
**Холодильная станция** (сооружение неустановленного назначения), инв. № 644/С-59422, общ. пл. 621,8 кв. м.
**Резервуар для воды** (сооружение неустановленного назначения), инв. номер 644/С-59421, общ. пл. 94,5 кв. м. Составные части и принадлежности: два дыхательных устройства.
**Адрес**: Минская обл., Солигорский р-н, г. Солигорск, ул. Константина Заслонова, 58, 58/1, 58/2.
**Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве аренды по 25.03.2120 для строительства и обслуживания здания и сооружений и объектов иного назначения, общ. пл. 0,4189 га

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 634 885,57 бел. руб.**
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Лот № 2. Здание базы отдыха «Дом рыбака»** (здание гостиниц, мотелей, кемпингов), инв. номер 633/С-10642, общ. пл. 93,6 кв. м. Составные части и принадлежности: кирпичная холодная пристройка, терраса, металлический навес, уборная.
**Адрес**: Минская обл., Мядельский р-н, Мядельский с/с, д. Шиковичи, д. 52А.
**Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве аренды по 11.10.2109 для обслуживания туристического объекта «База отдыха «Дом рыбака», общ. пл. 0,1353 га

**Начальная цена (с НДС 20 %) – 148 615,66 бел. руб.**
Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (**BYN**) перечисляется на счет **BY60BLBB30120191021390001001** в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона.
Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **4 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 02.08.2021 с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 30.07.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **+375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 12 августа 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5»

| Предмет торгов |
|---|
| Здание весовой АБЗ «Заславль» общей площадью 29,2 кв. м, инв. № в ЕГРНИ 600/С-122807 (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание весовой АБЗ «Заславль» с навесом 1, забором а 1, металлическим ограждением площадки для стоянки автомобилей а2, асфальтная площадка на АБЗ «Заславль» а3, технологическая площадка по хранению и обработке материалов а4) |
| Сведения о земельном участке: площадь – 2,2169 га, кадастровый номер – 623650100001005211 |
| Местонахождение: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Заводская, 17/1 |
| Начальная цена: 1 591 507,00 бел. руб. с учетом НДС |
| Сумма задатка: 159 000,00 бел. руб. |

**Продавец имущества:** ОАО «ДСТ № 5», г. Минск, ул. Лукьяновича, 4-253.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ № 5», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ОАО «Белинвестбанк», центр банковских услуг № 527, г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП получателя 190398583.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежного документа о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **12 августа 2021 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 20.07.2021 по 10.08.2021 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефону (017) 388-43-21.

**Телефоны для справок:**
**(017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**
**(017) 388-43-21, (029) 179-23-02 (ОАО «ДСТ № 5»).**

БАНК ТОРГОВЫЙ КАПИТАЛ
Закрытое акционерное общество

Наименование банка: **ЗАО «ТК Банк»**

**www.tcbank.by**

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
## на 1 июля 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2021 | 01.01.2021 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 1 451 | 1 552 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 1 876 | 3 285 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 95 445 | 88 025 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 35 271 | 39 530 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 10 178 | 10 029 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 31 313 | 31 313 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 3 153 | 3 317 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | 11 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 669 | 1 222 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | 1 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 23 586 | 23 610 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 202 942 | 201 895 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 9 725 | 9 503 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 4 876 | 2 919 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 138 | 4 823 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 14 739 | 17 245 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 61 651 | 61 651 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | 17 | 17 |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 21 000 | 20 000 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 1 516 | 1 285 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 104 019 | 101 697 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 188 203 | 184 650 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 202 942 | 201 895 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
## на 1 июля 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2021 | 01.07.2020 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 6 433 | 4 901 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 1 | 39 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 6 432 | 4 862 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 108 | 61 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 45 | 57 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 63 | 4 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (67) | (14) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | (300) | 2 227 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 193 | 2 389 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 675 | 3 189 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 3 289 | 5 346 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | - | 1 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 3 321 | 2 532 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 | 7 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 3 320 | 2 525 |

Председатель Правления С.Ф. Хайновский

Главный бухгалтер Н.А. Тиванова

Дата подписания: 02 июля 2021 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь, № 30 от 19.06.2013, БИК 153001333, УНП 807000163.

Открытое акционерное общество
## «Дорожно-строительный трест № 3»
### СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

**Собрание состоится 30 июля 2021 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

Собрание будет проводиться в смешанной форме.

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, – 22.07.2021.

**Повестка дня**
1. О принятии решения об объявлении и выплате дивидендов за I полугодие 2021 года.
2. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества путем изложения Устава в новой редакции.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 30 июля 2021 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с документами к собранию начиная с 20 июля 2021 года по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

**Справки по телефонам: 8 0222 236487, 236424 – ОЭАиП, Наблюдательный совет.**

УНП 700049607

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ООО «БЕССЕР-БЕЛ» (продавец)**

## Лот № 1: ПОГРУЗЧИК ТО-18,
**заводской № 925, инв. № 15, 1993 г. в.**
Начальная цена с НДС – 5640,00 руб. Задаток – 570,00 руб.

## Лот № 2: GAZ-3307,
**кузов (рама) № 330700E0221748.**
Начальная цена с НДС – 2160,00 руб. Задаток – 220,00 руб.

Местонахождение лотов: г. Минск, ул. Монтажников, 21. Шаг аукциона – 5 %.

**Аукцион состоится 20.08.2021 в 11.00** по адресу: **г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB301278029 00100000000 в ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений и задатков – **18.08.2021 в 11.00.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

# ЭЛЕКТРАТРАНСПАРТУ ШМАТ НЕ БЫВАЕ

## ПАРК ЭЛЕКТРАКАРАЎ ПАВЯЛІЧЫЎСЯ ПРАКТЫЧНА ЎДВАЯ

Адкрываючы дзень электратранспарту, **міністр энергетыкі Віктар КАРАНКЕВІЧ** адзначыў, што колькасць электрамабіляў у нашай краіне дасягнула чатыры тысячы штук. За першае паўгоддзе гэтага года ў нашу краіну ўвезена 2112 электрамабіляў — больш, чым за ўвесь мінулы год (1810 штук). Расце аб'ём спажывання электраэнергіі зараднымі станцыямі для электрамабіляў — за пяць месяцаў бягучага года ён склаў 3,8 млн кВт.г, што на 23 % больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

Віктар Каранкевіч заўважыў, што вядучыя краіны свету летась пачалі рух да глабальнай электрыфікацыі транспарту. Толькі ў 2020 годзе ў свеце было прададзена больш за тры мільёны электрамабіляў. Іх агульная колькасць перавысіла 10 млн адзінак. Па прагнозах Міжнароднага энергетычнага агенцтва, да 2030 года сусветны парк электрамабіляў можа вырасці да 145 млн. Аб сваім намеры адмовіцца ад выпуску аўтамабіляў з рухавіком унутранага згарання ўжо абвясцілі найбуйнейшыя аўтаканцэрны. Дынамічна абнаўляецца і парк гарадскога электрычнага транспарту.

«У павышэнні ўзроўню электрамабільнасці зацікаўлена і наша краіна. Для гэтага ствараюцца неабходныя ўмовы, прыняты стымулюючыя меры. Развіццё электратранспарту, пашырэнне сеткі зарадных станцый пазначана кіраўніком дзяржавы як адна з важных задач у бягучай пяцігодцы. Будаўніцтва Беларускай атамнай станцыі — гэта новыя магчымасці для ўмацавання патэнцыялу галіны», — падкрэсліў міністр.

**Кіраўнік адміністрацыі Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» Аляксандр ЯРАШЭНКА** расказаў, што ў парку згаданы кірунак актыўна развіваецца. «З 71 рэзідэнта, якія ў цяперашні час зарэгістраваныя ў «Вялікім камені», восем тым ці іншым чынам прасоўваюць тэму электратранспарту. Літаральна ў хуткім часе некалькі будучых рэзідэнтаў-інвестараў плануе таксама зайсці да нас у парк і развіваць дадзеную галіну», — адзначыў ён.

У сваю чаргу, **генеральны дырэктар СЗАТ «Кампанія па развіцці індустрыяльнага парка» Янь ГАН** адзначыў, што гэтым летам у розных кутках свету фіксуецца анамальна высокая тэмпература паветра. І Беларусь не выключэнне. Тут на працягу месяца стаіць гарачае надвор'е — гэта яркі прыклад праўлення глабальнага пацяплення. У сувязі з гэтым ААН у рамках глабальнага супрацоўніцтва ў сферы клімату актыўна прасоўвае выкарыстанне экалагічна чыстых крыніц энергіі, стварэнне «зялёнай» экасістэмы і забеспячэнне ўстойлівага развіцця нашага грамадства. У аўтамабільнай галіны, якая займае лідзіруючую пазіцыю па выкіду вуглякіслага газу ў атмасферу, пераход да новых крыніц энергіі і сыход ад традыцыйных паліўных крыніц з'яўляецца вельмі важным.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## НАШ МІНПРАМ НЕ СПІЦЬ У ШАПКУ — ТРАЛЕЙБУСЫ НА АЎТАНОМНЫМ ХАДУ

Ні для кога не сакрэт, што вядучыя краіны свету імкнуцца да поўнага пераходу на электратранспарт. Буйныя аўтаканцэрны анансавалі адмову ад выпуску аўтамабіляў з рухавікамі ўнутранага згарання — як легкавых, так і грузавых. Сёлета чакаецца з'яўленне каля 150 новых мадэляў электракараў. У Беларусі таксама адным з прыярытэтных напрамкаў у прамысловасці на найбліжэйшыя гады з'яўляецца развіццё электратранспарту. Пра тое, якая ў сувязі з гэтым работа праводзіцца ў сістэме Мінпрама, аб стратэгіі яе рэалізацыі, а таксама да чаго ідзе краіна ў галіне электрабудавання, распавёў **першы намеснік міністра прамысловасці Сяргей ГУНЬКО.**

Па яго словах, асноўная сфера прымянення электратранспарту — гэта пасажырскі транспарт. Над гэтым кірункам у Беларусі працуюць два прадпрыемствы — «Белкамунмаш» і Мінскі аўтазавод. Электрычны сегмент прадстаўлены тралейбуснай тэхнікай класічнай формы пабудовы, а таксама з аўтаномным ходам.

«Мы цалкам закрываем патрэбы краіны ў гэтым відзе тэхнікі. У прыватнасці, летась мы павялічылі магутнасці за кошт увядзення зборачнай вытворчасці ў Жодзіне.



На яго плошчах будуць выпускацца найноўшыя электробусы розных мадыфікацый. Штогод тут змогуць збіраць больш за 300 транспартных сродкаў. А гэта новыя магутнасці ў дадатак да тых, якія ўжо ёсць на МАЗе і «Белкамунмашы», — заявіў спецыяліст.

## ЭЛЕКТРОБУСЫ І ЭЛЕКТРАКАРЫ

Што датычыцца электробусаў, тут тыя ж лідары — «Белкамунмаш» і МАЗ. «Прадпрыемствы выкарыстоўваюць дзве розныя канцэпцыі пабудовы тэхнікі. Прычым абедзве з іх абсалютна жыццяздольныя. Канцэпцыя «Белкамунмаш» заснаваная на хуткіх зарадных станцыях. Методыка МАЗа грунтуецца на большай ёмістасці батарэі», — растлумачыў прадстаўнік Мінпрама.

У сферы грузавога электратранспарту распрацоўваецца канцэпцыя машыны для рытэйл-сетак, здольнай перавозіць да 10 тон тавару, а таксама электрагрузавік, але з меншай грузападымальнасцю — да 6 тон.

Распрацоўкай легкавых электрычных машын займаецца завод «БелДжы». «У нас ёсць вялікае жаданне арганізаваць у Беларусі масавую вытворчасць электрычных аўтамабіляў. Маюцца дамоўленасці з кампаніяй «Джылі» па першай тысячы адзінак ужо сёлета. Узор у нас ужо ёсць. Машына сабрана на абсталяванні ў нашай краіне. Мы плануем у найбліжэйшы час правесці яго тэсціраванне. Дарэчы, літаральна нядаўна пачалі прымаць заказы на першую партыю дадзеных машын і ўжо атрымалі запыт на 254 машыны. Што наконт кошту, наша пазіцыя такая: цана не павінна перавышаць 30 тысяч долараў», — расказаў Сяргей Гунько. Першапачатковa будзе ствараецца машына прадстаўнічага класа. Услед за яе выпускам, можна падумаць і над спрошчанай камплектацыяй. Такая машына будзе крыху таннейшая.

«Першая прамысловая партыя неабходная для таго, каб вывучыць гэты рынак, паказаць новую мадэль, прывіць культуру куплі электрамабіля з дапамогай сістэмы крэдытавання і лізінгу», — дадаў ён.

## РУХАВІКІ І АКУМУЛЯТАРЫ

Наконт элементнай базы Сяргей Гунько адзначыў: «Трэнд такі — спачатку мы прыцягваем максімальна вядомыя брэнды. Калі вытворчасць адладжана і атрыманы прадукт — займаемся лакалізацыяй. Адзін з буйных праектаў, які мы хочам завяршыць у пачатку наступнага года, — гэта цягавы рухавік для электробусаў. Дадзены праект мы рыхтуем сумесна з Інстытутам машынабудавання Акадэміі навук. Ужо атрыманы вопытныя ўзоры рухавіка і адпрацаваны тэхнічныя рашэнні. Вырабы нядрэнна сябе зарэкамендавалі, і ў планах на базе «Магілёўліфтмаша» стварыць новую вытворчасць гэтых рухавікоў».

Гаворачы аб стварэнні акумулятараў на базе айчыннай вытворчасці, прадстаўнік Мінпрама звярнуў увагу, што акумулятар — даволі складаная прылада з вялізнымі патрабаваннямі. «Асноўны элемент акумулятара — гэта ячэйкі. Яны ў Беларусі не вырабляюцца, таму што ў нас няма неабходных карысных выкапняў. У асноўным такую прадукцыю выпрабляе Кітай, — сказаў спецыяліст. — Напрыклад, «Белкамунмаш» максімальна лакалізаваў сябе ў будаўніцтве акумулятарных батарэй. Завод набывае ў розных вытворцаў ячэйкі і на іх базе робіць акумулятары. У сваю чаргу, МАЗ правёў плённыя перагаворы з кампаніяй-пастаўшчыком батарэй. Спадзяёмся, што створым сумесную вытворчасць».

«Для аўтамабіляў мы яшчэ не гатовыя распрацоўваць такія высокаінтэлектуальныя прадукты, бо, на жаль, у нас няма досве-



ду поўнага цыклу вытворчасці электрычных машын. Такім чынам, казаць пра акумулятары яшчэ рана», — заявіў Сяргей Гунько.

## ЗАРАДНЫЯ СТАНЦЫІ: ДЛЯ СЯБЕ І НА ПРАДАЖ

Вытворчасцю зарадных станцый у краіне займаюцца чатыры кампаніі. Нацыянальны аператар ВА «Беларуснафта» — «Маланка», працуе з імі.

**Намеснік генеральнага дырэктара ВА «Беларуснафта» Андрэй КОЦІК** распавёў, што першыя суперхуткія электразарадныя станцыі з'явяцца ў Беларусі ў 2022 годзе. Ужо праз год — у ліпені ў Мінску будзе запушчаны першы суперхуткі зарадны комплекс для электрамабіляў. У прапрацоўцы — праект па ўстаноўцы зарадных станцый і для электробусаў. «У тых месцах, дзе ёсць попыт на зарадку электрамабіляў, мы плануем ставіць суперхуткія комплексы як для электрамабіляў, так і для электробусаў», — растлумачыў Андрэй Коцік.

Акрамя таго, у рамках супрацоўніцтва з ПРААН будзе рэалізаваны праект па ўстаноўцы трох суперхуткіх зарадных комплексаў на трасе М1. У цэлым, сёння ў краіне маецца 450 зарадных станцый для электрамабіляў, да канца 2021 года іх колькасць вырасце да 600.

У сваю чаргу, **намеснік міністра энергетыкі Дзяніс МАРОЗ** адзначыў: «Лічым, што для аптымізацыі матэрыяльных і часавых выдаткаў устаноўка электразарадных станцый павінна ажыццяўляцца ў першую чаргу паблізу падстанцый, дзе маецца адпаведны рэзерв магутнасці».

Фактычна, па зарадных станцыях наша краіна сёння можа ў поўным аб'ёме задаволіць заказчыка і пакупніка. Такія «падзарадкі» можна ўстанаўліваць у двары і гаражы — бо ёсць самы шырокі выбар мадыфікацый.

Сяргей Гунько таксама нагадаў, што сумесна з Міністэрствам эканомікі распрацаваны праект указа, які прадугледжвае падатковыя і іншыя льготы для юрыдычных асоб пры куплі электрамабіля, а таксама стымулюючыя меры для насельніцтва. Праект дакумента ўзгадняецца з урадам і ў канцы лета — пачатку верасня будзе прадстаўлены кіраўніку дзяржавы. «У цэлым у Беларусі мы разлічваем стварыць усе кірункі вытворчасці электратранспарту. Да канца года мы хочам закрыць усе нішы рэальнага і ў будучыні магчымага рынку эксплуатацыі электрычных машын, — падсумаваў Сяргей Гунько.

## МАШЫНЫ МАЛЕНЬКІЯ, АЛЕ Ж СВАЕ

На выстаўцы былі прадстаўлены як легкавыя аўто, так і спецтэхніка на электрацязе. Напрыклад, лёдазаліўная машына МТЗ. У ліку экспанатаў — электробусы «Белкамунмаш» і МАЗ, адны з апошніх мадэляў электрамабіляў Tesla, BMW, Chevrolet.

Сярод знакамітых экспанатаў арыгінальнасцю вылучалася адна мадэль, распрацаваная айчыннымі навукоўцамі.

**Намеснік начальніка НДЦ «Электрамеханічныя і гібрыдныя сілавыя ўстаноўкі мабільных машын» Аб'яднанага інстытута машынабудавання НАН Беларусі Дзмітрый КАБАНАЎ** пазнаёміў нас са сваёй распрацоўкай у сферы электратранспарту. Гэта макетны ўзор каркасна-панэльнага электрамабіля Academic Electro. Ён прызначаны для перавозак па закрытых тэрыторыях (без выезду на дарогі агульнага карыстання) і разлічаны на двух пасажыраў. Максімальная хуткасць — 50 км/г. Каркасна-панэльны тып кузава дазваляе ажыццяўляць выпуск дробнымі серыямі пад патрабаванні заказчыка.

«Яго асаблівасць у тым, што сілавая частка кабіны не ўтрымлівае металічных элементаў: яна зроблена з шклапластыку. Уся кіравальная электроніка распрацавана і выраблена ў нас. Гэта электрамабіль для закрытых тэрыторый (лясныя гаспадаркі, паркі, прадпрыемствы). Калі на такую машыну будзе попыт, можна дапрацаваць гэтую мадэль, каб яна магла ездзіць па дарогах агульнага карыстання і з большай хуткасцю», — распавёў Дзмітрый Кабанаў.

Што ж, магчыма, і гэтую мадэль мы хутка ўбачым у рэальным жыцці.

**Сяргей КУРКАЧ, фота аўтара.**

Сумесны выпуск газеты «Звязда»
і Міністэрства прыродных рэсурсаў
і аховы навакольнага асяроддзя
№ 4 (58)

Міжнароднае супрацоўніцтва

# «ЗАПАВЕДНАЕ ПААЗЕР'Е» І ГРАМАДСКІЯ ЭКСПЕРТЫ

## Мінпрыроды Беларусі і расійская грамадская арганізацыя абмеркавалі шляхі супрацоўніцтва ў прыродаахоўнай сферы



Фота прэс-службы Мінпрыроды.

**Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК і старшыня агульнарасійскай грамадскай арганізацыі «Расійскае экалагічнае таварыства» Рашыд ІСМАІЛАЎ абмеркавалі магчымасць наладжвання двухбаковага супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў.**

Падчас сустрэчы Андрэй Худык расказаў пра работу Мінпрыроды з грамадскасцю Беларусі: «Намі пабудавана ўзаемадзеянне і цеснае супрацоўніцтва з грамадзянамі і грамадскімі арганізацыямі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў па некалькіх кірунках, якія дазваляюць ахапіць практычна ўсе мэтавыя групы. Дзякуючы гэтаму, кожны добрасумленны грамадзянін Рэспублікі Беларусь можа ўзняцца на абарону навакольнага асяроддзя ў якасці грамадскага эколага і браць актыўны ўдзел у прыродаахоўнай дзейнасці».

Узаемаадносіны Мінпрыроды з грамадзянамі і грамадскімі аб'яднаннямі будуюцца на базе грамадскіх каардынацыйных экалагічных саветаў (ГКЭС). У Беларусі працуюць восем ГКЭС — пры цэнтральным апараце, у Мінскім гарадскім і кожным абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Міністр таксама адзначыў, што паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй дзейнічае шэраг пагадненняў у галіне аховы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў і барацьбы са змяненнем клімату, у тым ліку аб супрацоўніцтве ў галіне аховы і рацыянальнага выкарыстання трансгранічных водных аб'ектаў, аб супрацоўніцтве ў галіне нетракарыстання, аб стварэнні трансгранічнай асабліва ахоўнай прыроднай тэрыторыі «Запаведнае Паазер'е».

Удзельнікі сустрэчы выказалі зацікаўленасць у наладжванні партнёрскіх адносін і развіцці супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі. Андрэй Худык праявіў цікавасць да вывучэння вопыту Расійскай Федэрацыі ў галіне прыцягнення грамадскасці да вырашэння экалагічных пытанняў аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, а таксама ў наладжванні адносін з грамадскімі аб'яднаннямі краіны-суседкі для рэалізацыі сумесных мерапрыемстваў на нацыянальных і міжнародным узроўнях.

Паміж Рэспубліканскім цэнтрам дзяржаўнай экалагічнай экспертызы і павышэння кваліфікацыі Мінпрыроды, на базе якога праходзіла сустрэча, і Расійскім экалагічным таварыствам падпісаны пратакол аб намерах супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў. Дакумент прадугледжвае развіццё сумеснай адукацыйнай дзейнасці па экалагічнай асвеце насельніцтва, праграмы ўзаемадзеяння па прыгранічных асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях і трансгранічных водных аб'ектах, экалагічным турызме, маніторынгу і развіцці інстытута грамадскіх экспертаў у галіне экалогіі і аховы навакольнага асяроддзя.

**Анастасія АНІШЫНА, студэнтка факультэта журналістыкі БДУ.**

Экатэхналогіі

# Закопваць нельга выкарыстоўваць

## Што робіцца для памяншэння колькасці адходаў і іх перапрацоўкі ў Беларусі

**Штогод у краіне захоўваецца 3,1 млн тон адходаў. За апошнія пяць гадоў больш як утрая вырас узровень выкарыстання камунальных смецця, а да канца 2021-га плануецца закрыць усе міні-палігоны. Тым не менш, сёлета ўжо выяўлена звыш 9000 фактаў размяшчэння адходаў у несанкцыянаваных месцах, што сведчыць пра неабходнасць стварэння новых праектаў для паляпшэння экалагічнай сітуацыі з адходамі. Пра кірункі дзейнасці ў дадзенай сферы расказалі эксперты.**

### РЭГІЯНАЛЬНЫЯ КОМПЛЕКСЫ ЗАМЕСТ МІНІ-ПАЛІГОНАЎ

Сістэма абыходжання з камунальнымі адходамі ў краіне стала актыўна развівацца з 2012 года, калі быў уведзены прынцып пашыранай адказнасці вытворцаў. Згодна з ім, сродкі вытворцаў і імпарцёраў тавараў прыцягваюцца для стварэння сістэмы збору і выкарыстання адходаў, якія ўтвараюцца ў грамадзян, заўважыла **Вольга САЗОНАВА, начальнік галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

*— У рамках кантрольнай дзейнасці абследавалі каля 2000 аб'ектаў пахавання цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА), у выніку якіх выяўлена больш як 880 фактаў пахавання другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР) і звыш 2000 фактаў парушэння правілаў эксплуатацыі палігонаў. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута больш за 170 асоб. Гэтыя лічбы сведчаць аб тым, што яшчэ ёсць над чым працаваць.*

Каб зменшаць негатыўны ўплыў пахаванняў смецця на наваколле і для аптымізацыі сістэмы абыходжання з адходамі ў цэлым прадугледжана памяншэнне колькасці міні-палігонаў. Сёлета было рэкультывавана больш як 30 выведзеных з эксплуатацыі аб'ектаў, зроблена абвалоўка агароджаў тых, што дзейнічаюць. Вядзецца работа па стварэнні сучасных рэгіянальных комплексаў па сарціроўцы і выкарыстанні ЦКА.

### БЕЗ СМЕЦЦЕПРАВОДА ЛЕПШ

У сталіцы працягваецца закрыццё смеццеправодаў у шматкватэрным жыллі, якое ажыццяўляецца згодна з Нацыянальнай стратэгіяй па абыходжанні з ЦКА і ДМР, паведаміла **Настасся ВАРАБ'ЁВА, намеснік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні, санітарным утрыманні жыллёвага фонду і рабоце з насельніцтвам Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі:**

*— Сёлета ў 45 дамах закансерваваны 86 смеццеправодаў. У дамах, дзе тыя былі закрытыя раней, ужо ёсць экалагічны вынік. Жыхары сталі збіраць больш другасных матэрыяльных рэсурсаў, у будынках няма смуроду, зніклі ўмовы для пацукоў і іншай жыўнасці. А тарыф на паслугу абыходжання з адходамі, дзе няма смеццеправодаў, меншы на 1,5 рубля за м³. Прыватныя сталічныя сядзібы, дарэчы, летась забяспечылі пластыкавымі кантэйнерамі па 120 літраў для раздзельнага збору ЦКА.*



### БЕЛЫ ШКЛАБОЙ — САБЕ, АСТАТНІ — НА ЭКСПАРТ

Каля 6 % у агульным зборы адходаў забяспечваюць арганізацыі холдынга «Белрэсурсы». Найбольшая частка гэтага смецця (каля 60 %) — гэта нарыхтоўка ДМР ад насельніцтва. У холдынгу дзейнічаюць 156 прыёмных пунктаў.

Чатыры таварыствы «Белрэсурсаў» займаюцца таксама і перапрацоўкай адходаў. Гэта Барысаўскі завод пластмасавых вырабаў, «Белдругпалімер», «Гомельхімгандль», кіруючая кампанія холдынга па перапрацоўцы шкла. Аднак магутнасці апошняга прадпрыемства пакуль загружаюцца шклабоем толькі на 90 тысяч тон з магчымых 120 тысяч, адзначыў **Максім БЯСПАЛЫ, начальнік упраўлення па абыходжанні з другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі холдынга «Белрэсурсы»:**

*— На ўнутраны рынак краіны пастаўляем увесь аб'ём белага шклабою і часткова карычневага. Але арганізацыя не забяспечвае заяўкі айчынных перапрацоўчых арганізацый на паўбелы шклабой, які найбольш запатрабаваны. З неабходных прадпрыемствам 50 тысяч тон у год «Белрэсурсы» забяспечваюць толькі 36 тысяч тон. Астатні незапатрабаваны ў краіне аб'ём вымушаны экспартаваць. Цэны за мяжой на гэтую сыравіну, дарэчы, у паўтара раза вышэйшыя, чым у Беларусі.*

Тым не менш, згодна з планамі па зніжэнні выкарыстання палімернай упакоўкі, у Беларусі плануецца стварыць пляцоўку для павелічэння аб'ёмаў перапрацоўкі адходаў шкла, калі іх пабольшае. Прыблізны кошт праекта — 11 млн еўра.

Прадпрыемства «Белдругпалімер» да канца года плануе рэалізаваць праект па павелічэнні аб'ёмаў палімерных адходаў, у тым ліку павышанай забруджанасці. Гэта дазволіць павысіць перапрацоўку на 2 тысячы тон. А барысаўскі завод да канца 2023 года мяркуе павялічыць свае магутнасці на 6 тысяч тон.

### РАЗУМНАЕ СПАЖЫВАННЕ — ЗАКОННА І СУМЛЕННА

Наша будучыня — гэта разумнае спажыванне. Каб дасягнуць мэты збіраць 99 % адходаў, трэба замяшчаць экалагізацыяй вытворчасці — зніжэннем колькасці выкідаў і стварэннем прадукцыі, якую можна перапрацаваць, падкрэсліла **Наталля БУРАЯ, вядучы спецыяліст па інфармацыйнай рабоце дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў»:**

*— Каб знізіць колькасць утвараемых адходаў, прапанавана абмежаваць абарот некаторых відаў пластыкавай упакоўкі. Аднак пакуль працэс тармозіцца, бо Беларусь знаходзіцца ў ЕАЭС, а не ўсе краіны эканамічнага саюза гатовыя для ўкаранення нормаў аб бяспецы ўпакоўкі.*

Калі кожны будзе ведаць, што ўсе ўтвараемыя ім адходы застануцца на палігонах, то ён пачне ўсведамляць, што трэба набываць тавары ў бяспечнай і прыдатнай для перапрацоўкі ўпакоўцы. У законе сказана, што калі для чалавека створаны ўмовы для раздзельнага збору смецця, а той іх не выконвае, то яго можна аштрафаваць на суму да 30 базавых велічынь. Такая мера працуе ў Еўропе, дзе жыхары сумленна сарціруюць адходы, бо ведаюць, што за парушэнне існуе пакаранне, нагадала спецыяліст:

*— Існуе праблема і з нядобрасумленнымі перавозчыкамі смецця, якія скідваюць асобна сабраныя адходы ў адзін смеццявоз. Мы просім тых, хто заўважыў такое парушэнне, звярнуцца са скаргай непасрэдна да кіраўніцтва перавозчыка або ў органы мясцовай улады.*

**З 2014 года на прадпрыемстве «Экарэс» працуе аб'ект па абясшкоджванні медыцынскіх адходаў, куды паступае 220—250 тон такіх адходаў першага і другога класа небяспекі.**

**З 2018 года пачалася перапрацоўка палімерных адходаў, у прыватнасці, ПЭТ-бутэлек — штогод атрымліваецца каля 42—43 тон ПЭТ-шматкоў. Каля 20 тысяч тон гатовай прадукцыі атрымлівае прадпрыемства ад перапрацоўкі жалезабетону.**

### ДМР НА ПАЛІГОНЕ

У Мінску адходы захоўваюцца на палігоне «Трасцянецкі». Сёлета распачата работа па планаванні будаўніцтва яго трэцяй чаргі, бо ў цяперашніх межах звалкі хопіць толькі гады на тры. Летась, напрыклад, сюды прыехала каля 650 тысяч тон адходаў.

Пры гэтым з 2016 да 2020 года колькасць адходаў, якія паступаюць на палігон, значна (на 35 %) зменшылася, найперш праз зніжэнне на 75 % прамысловых адходаў і прыкладна на 18 % — камунальных, падзяліўся **Ігар СУХАРЭВІЧ, галоўны інжынер унітарнага прадпрыемства «Экарэс», якое займаецца пахаваннем і абясшкоджваннем адходаў, у тым ліку медыцынскіх і радыеактыўных.**

Прадпрыемства таксама збірае ДМР, якія паступаюць ад нарыхтоўчых пунктаў, вымаюцца на лініях сарціроўкі. Такім чынам нарыхтоўваецца каля 17—18 тысяч тон другасных рэсурсаў, у асноўным — паперы, кардону, шкла і палімераў.

*— Гады тры таму стала практыкавацца выманне ДМР на самім палігоне, бо магутнасцяў сарціроўкі камунальных адходаў пакуль не хапае. Заключаюцца дагаворы з фізічнымі асобамі, а таксама ГУУС Мінгарвыканкама па прадастаўленні адміністрацыйных парушальнікаў для такіх работ. Такім чынам штогод нарыхтоўваецца каля 2-2,5 тысячы тон ДМР, — удакладніў інжынер.*

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Прыродны здабытак

# Палессе — намінант для ЮНЕСКА

**Адзін з найбуйнейшых рэгіёнаў Еўропы, якому ўдалося захавацца амаль што ў натуральным стане, — беларускае Палессе. Але вось толькі пра яго мала хто ведае на міжнародным узроўні, ды і самі беларусы маюць вельмі слабае ўяўленне пра гэты сапраўдны прыродны цуд. Перспектывы Палесся як буйнога турыстычнага аб'екта абмяркоўвалі ўдзельнікі круглага стала «Патэнцыял агратурызму і экатурызму на Палессі», арганізаванага грамадскімі арганізацыямі «Багна» і «Ахова птушак Бацькаўшчыны» пры падтрымцы Франкфурцкага заалагічнага таварыства.**



Паводка на Прыпяці.

Фота аўтара.

## ЕЎРАПЕЙСКАЯ АМАЗОНІЯ

Наша Палессе — гэта ўнікальныя прыродныя ландшафты, тут ёсць мноства відаў раслін і жывёл, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення. За багацце азёр, рэк і балот Палессе называюць Еўрапейскай Амазоніяй. Агульная плошча рэгіёна складае каля 186 000 км$^2$, што ў два разы больш за плошчу Партугаліі. «Амазонія» — трансгранічны аб'ект, бо размяшчаецца на тэрыторыі Украіны (94000 км$^2$), Беларусі (62000 км$^2$), Расіі (23000 км$^2$) і Польшчы (7000 км$^2$).

Палессе ўжо даўно павінна было б стаць знакамітым турыстычным брэндам. Аднак тут да гэтага часу няма добрай турыстычнай сеткі, адсутнічае трансгранічнае супрацоўніцтва ў сферы турызму. Чарнобыль — адзінае месца на тэрыторыі Палесся, вядомае на турыстычным рынку. Ды і тое яго першаадкрывальнікам была Украіна. Беларуская частка Чарнобыльскай зоны стала даступная турыстам толькі з 2019 года, гаворыцца ў дакладзе «Еўрапейская «Амазонія». Стратэгія развіцця прыроднага турызму». Дакумент падрыхтаваны кааліцыяй з шасці прыродаахоўных арганізацый Беларусі, Польшчы, Украіны і Германіі і змяшчае сцэнарыі альтэрнатыўнага развіцця Палесся.

Як адзначаюць аўтары даследавання, мільёны еўрапейскіх турыстаў гіпатэтычна гатовыя ехаць на Палессе, каб убачыць тут дзікую прыроду. Напрыклад, у Вялікабрытаніі толькі ў Каралеўскім таварыстве абароны птушак больш за мільён членаў. А Палессе можа стаць адным з самых важных напрамкаў для назірання за птушкамі ў Еўропе. Велізарным патэнцыялам вызначаюцца туры па асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях, сплавы па рэках, у прыватнасці, у перыяд паводкі, якая здараецца раз на некалькі гадоў.

## ЧЫМ КАРЫСНЫ СТАТУС АБ'ЕКТА ЮНЕСКА?

Сусветная турысцкая арганізацыя прагназуе, што да 2030 года адбудзецца змена турыстычных прыярытэтаў, калі больш за палову ўсіх візітаў турыстаў будзе прыпадаць на краіны з эканомікай, якая развіваецца. Яшчэ да пандэміі COVID-19 спецыялісты адзначалі цікавасць турыстаў да нетрадыцыйных напрамкаў, малавывучаных краін. Усе, хто падарожнічае, ужо нацешыліся «пакетным» адпачынкам, прыйшоў час цікавасці да натуральных ландшафтаў, флоры і фаўны, новых і ўнікальных уражанняў. Усё гэта ёсць у дадзеным рэгіёне.

Але як яго прасоўваць? **«Ёсць планы надаць Палессю статусы аб'екта Сусветнай прыроднай спадчыны ЮНЕСКА і біясфернага рэзервата ЮНЕСКА», — паведаміў каардынатар праграм Франкфурцкага заалагічнага таварыства ў Беларусі, спецыяліст АПБ па прыродаахоўных пытаннях Віктар ФЯНЧУК.**

Ён патлумачыў, што цяпер толькі Белавежская пушча сумяшчае абодва гэтыя статусы. Біясфернымі рэзерватамі на ўзроўні ААН прызнаныя яшчэ дзве тэрыторыі — Бярэзінскі запаведнік і Прыбужскае Палессе.

Эксперт патлумачыў, што аб'ектамі Сусветнай прыроднай спадчыны прызнаюцца толькі тыя, якія маюць асаблівую экалагічную значнасць, у той час як статус біясфернага рэзервата падкрэслівае сацыяльна-прыроднае адзінства тэрыторый.

Ідэя аб намінаванні Палесся на аб'ект ЮНЕСКА падтрымана ў Мінпрыроды.

Мяркуецца, што на Палессі аб'ект ЮНЕСКА будзе мець трансгранічны статус, закране беларускія і ўкраінскія тэрыторыі. Ядром выступіць нацыянальны біясферны рэзерват «Прыпяцкае Палессе», створаны ў 2016 годзе ў межах трох беларускіх ААПТ — заказнікаў «Альманскія балоты», «Стары Жадзен» і нацпарку «Прыпяцкі».

Віктар Фянчук паведаміў, што цяпер АПБ у рамках праекта «Палессе — дзікая прырода без межаў» рыхтуе пакет дакументаў, якія трэба перадаць у ЮНЕСКА да 1 лютага 2022 года. Потым спецыялісты пачнуць падрыхтоўку асноўнай заяўкі.

*«Як паказваюць даследаванні, само па сабе намінаванне аб'екта не стымулюе наведванне тэрыторый у адрозненне ад зорак Мішлен, — падзяліўся Віктар Фянчук. — Аднак статус аб'екта спадчыны ЮНЕСКА гарантуе развіццё турызму праз ускосныя механізмы, у тым ліку за кошт прытоку інвестыцый на развіццё інфраструктуры, умацаванне аховы прыроды, трансгранічнае супрацоўніцтва».*

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**

На шляху да Мэт

# У трэндзе — ветраэнергетыка

**Недарагая і чыстая энергія — адна з мэт Парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года. Першы ветрагенератар у Беларусі з'явіўся ў 2000 годзе. А ў 2022-м будзе ўведзены ў эксплуатацыю самы буйны ветрапарк устаноўленай магутнасцю 25 МВт.**



## ЧАМУ ДАДЗЕНАЯ ТЭМА ТАКАЯ ВАЖНАЯ?

У нашай краіне рэалізуецца дзяржаўная праграма «Энергазберажэнне», якая разлічана на 2021—2025 гады. Яна прадугледжвае дасягненне долі аднаўляльных крыніц энергіі ў валавым спажыванні паліўна-энергетычных рэсурсаў на ўзроўні 8 % і зніжэнне энергаёмістасці ВУП на 7 % да ўзроўню 2020 года.

Беларусь далучылася да Рамачнай канвенцыі ААН аб змяненні клімату, Кіёцкага пратакола і Парыжскага пагаднення да яе. З мэтай выканання міжнародных абавязацельстваў наша краіна падтрымлівае развіццё аднаўляльнай энергетыкі, бо тая спрыяе скарачэнню выкідаў парніковых газаў і забруджвальных рэчываў у атмасферные паветра. У выпадках атрымання энергіі з біягазу і розных відаў біямасы адначасова вырашаюцца пытанні ўтылізацыі адходаў. Аднаўляльныя крыніцы энергіі эканамічна выгадныя, бо вецер і сонца нам дорыць прырода.

## ЦІ ПАДЫХОДЗІЦЬ КЛІМАТ?

Першы вятрак у Беларусі з'явіўся ў 2000 годзе. А да таго было шмат скептыкаў: маўляў, у нас неспрыдатны клімат, няма моцнага ветру. Тым не менш, па словах **Марыны БЕЛАВУС, кіраўніка праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Ліквідацыя бар'ераў для развіцця ветраэнергетыкі ў Рэспубліцы Беларусь»,** у нас можна сучасныя ветрагенератары ўстанаўліваць, а выпрацаваную імі энергію выкарыстоўваць у прамысловых маштабах.

Мэта 7: недарагая і чыстая энергія

Забеспячэнне ўсеагульнага доступу да недарагіх, надзейных, устойлівых і сучасных крыніц энергіі

Такім чынам, наш клімат падыходзіць для работы ветрагенератараў. Да таго ж тэхналогіі не стаяць на месцы. Цяпер дзеючыя генератары пры моцных парывах ветру аўтаматычна спыняюць сваю работу, каб не пашкодзіць платформы, на якіх яны ўстаноўлены.

## САМАМУ БУЙНОМУ ВЕТРАПАРКУ БЫЦЬ!

З 2015-га да чэрвеня 2021 года ў нашай краіне рэалізоўваўся праект «Ліквідацыя бар'ераў для развіцця ветраэнергетыкі ў Рэспубліцы Беларусь». Яго бюджэт склаў больш за тры мільёны долараў ЗША, якія вылучылі наша краіне ГЭФ і ПРААН.

«Сродкі праекта ГЭФ дазволілі цалкам сфарміраваць патэнцыял па правядзенні ветравымярэнняў, актуалізаваць Дзяржаўны кадастр аднаўляльных крыніц энергіі, ствapыць інфармацыйны рэсурс «Атлас вятроў Рэспублікі Беларусь». У ходзе рэалізацыі праекта быў прыняты шэраг нарматыўных прававых актаў, якія спрыяюць інвестыцыйнай дзейнасці ў галіне аднаўляльнай энергетыкі, а таксама садзейнічаюць выкананню абавязацельстваў, прынятых Беларуссю па міжнародных кліматычных пагадненнях», — растлумачыла Марына Белавус.

Дзякуючы гэтаму праекту за кошт сродкаў ГЭФ былі праведзены перадінвестыцыйныя работы па пяці пляцоўках для будаўніцтва ветрапаркаў у нашай краіне. Для гэтага зрабілі вымярэнні ветравога патэнцыялу па міжнародных стандартах, распрацавалі перадпраектную дакументацыю, правялі ацэнку ўздзеяння на навакольнае асяроддзе, атрымалі неабходныя ў адпаведнасці з заканадаўствам дазволы для стварэння ветраэнергетычных установак. Першы перадінвестыцыйны актыў быў прададзены ў выніку адкрытага аўкцыёну інвестару — турэцкай кампаніі «Гюрыш». Яна інвесціруе ў рэалізацыю праекта 46 млн еўра, дзякуючы чаму ўжо ў 2022 годзе ў Беларусі з'явіцца самы буйны ветрапарк устаноўленай магутнасцю 25 МВт.

Падводзячы вынікі праекта, Марына Белавус адзначыла, што яго дзейнасць спрыяла больш цеснаму ўзаемадзеянню зацікаўленых міністэрстваў у развіцці аднаўляльнай энергетыкі ў краіне, а таксама прадукцыйнаму супрацоўніцтву дзяржаўных органаў, бізнесу, фінансавых інстытутаў і грамадскіх аб'яднанняў па пытаннях аднаўляльнай энергетыкі і барацьбы са змяненнем клімату.

Акрамя таго, праектам была ўдзелена ўвага ролі жаночай ініцыятывы для развіцця аднаўляльнай энергіі ў сельскай мясцовасці — праведзена навучанне сацыяльна актыўных жанчын, напрацаваны матэрыялы, якія дазваляюць не толькі падрыхтаваць праект па стварэнні аб'екта аднаўляльнай энергетыкі, але і знайсці варыянты яго фінансавання.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

**Чытайце ў ліпеньскім нумары часопіса «Родная прырода»:**

- Стойкія арганічныя забруджвальнікі — на экспарт
- Як арганізаваць «зялёны» адпачынак
- У падарожжа з гадаванцам: сакрэты падрыхтоўкі
- Ствараем прыродны акварыум
- Чаму вугор токам б'ецца?



## О реализации имущества индивидуального предпринимателя Кудряшова А. А.

**Сведения об организаторе торгов: ООО «Госторги»: 210027, г. Витебск, пр-т Строителей, 6, а/я 77, e-mail: info@auction24.by, тел. +375 (29) 8-185-185**

**Продавец: Индивидуальный предприниматель Кудряшов А. А., УНП 391428915, 211391, г. Орша, ул. Пролетарская, д. 6, кв. 9, тел. +37529 7177010**

**Форма, дата, время, место проведения торгов:** повторные электронные торги в форме аукциона будут проводиться **04.08.2021** на электронной торговой площадке «Аукцион 24», расположенной по адресу: https://auction24.by. Торги с повышением начальной цены начинаются **04.08.2021 (среда)** и длятся один день с 09.00 до 16.00

**Сведения о предмете торгов, начальная цена предмета торгов:** всего сформировано **1 (один)** неделимый лот. Начальная цена лота указана без учета НДС. **Продавец освобожден от уплаты НДС в соответствии с действующим законодательством**

**Наименование: лот включает в себя два капитальных строения: а) инв. № 240/С-28531**, наименование – **электрокотельная** автоматизированная аккумуляторная с 2 электронагревателями ЭПЗ-100 ИЗ, общей площадью 35,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером: 242400000001004568 по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. 1Мая, 109Е; **б) инв. № 240/С-28533**, наименование – **склад** продовольственных и промышленных товаров, общей площадью 704,3 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером: 242400000001004410 по адресу: Витебская область, г. Орша, ул. 1 Мая, д. 109Ж. **Начальная цена лота: 53 400,00** руб. **Размер задатка (10 %): 5 340,00** рублей. **Шаг торгов (5 %): 2 670,00** руб.

Имеющиеся обременения в отношении имущества: арест ОПИ Оршанского района. Осмотреть имущество можно в любое время по предварительной договоренности с организатором торгов и (или) продавцом (собственником имущества). **Шаг аукциона и порядок проведения торгов:** шаг аукциона устанавливается в размере **5 (пяти) процентов** от начальной цены (стоимости) каждого лота с округлением в большую сторону до целого числа. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наибольшую цену за предмет торгов (лот). Результаты торгов оформляются протоколом. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. В случае признания торгов несостоявшимися предмет аукциона (лот) может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претенденту на покупку), при его согласии, по начальной цене, увеличенной на пять процентов. **Размер задатка для участия в торгах:** задаток в сумме 10 % от начальной цены (стоимости) лота перечисляется до подачи заявления на расчетный счет организатора торгов (оператора ЭТП) – **ООО «Госторги» BY30 PJCB 3012 2032 3510 0000 0933 в ОАО «Приорбанк» г. Минск, БИК PJCBBY2X, УНП 391827288. Сроки и место приема заявлений для участия в торгах и прилагаемых к ним документов:** заявления на участие в электронных торгах, платежный документ о перечислении задатка с отметкой банка, копии свидетельства о государственной регистрации, учредительных документов, а также документов, подтверждающих полномочия участника торгов (доверенности), направляются по эл. почте: info@auction24.by, начиная с **08.00 15.07.2021** и заканчивая в срок не позднее **02.08.2021 до 17.00**. Дополнительно для участия в электронных торгах на ЭТП «Аукцион 24» необходимо пройти регистрацию в качестве участника электронных торгов и подать заявку в электронном виде. **Подробная информация размещена на сайте** https://auction24.by. Ранее опубликованные извещения (объявления) с полной информацией о лотах: в газете «Звязда» – 12.06.2021, на сайте https://auction24.by – 12.06.2021

---

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | | |
|---|---|---|---|
| Продавец | ОАО «Гомельдрев», г. Гомель, ул. Достоевского, 3 | | |

**Предмет аукциона (одним лотом)**
**Месторасположение:**
**Гомельская обл., г. Гомель, ул. Техническая 1-я, д. 38**

| Наименование (назначение) | Инвентарный номер | Общ. пл., кв. м | Адрес (№ дома) |
|---|---|---|---|
| **Склад** (здание нежилое) | 350/С-201331 | 406 | 38 |
| Составные части и принадлежности: подвал, вход в подвал, пристройка, крыльцо | | | |
| **Склад кирпичный** (здание нежилое) | 350/С-201330 | 124,1 | 38 |
| **Мехмастерская, гараж** (здание нежилое) | 350/С-201329 | 308 | 38 |
| **Тарный цех** (здание нежилое) | 350/С-201328 | 134,4 | 38 |
| **Здание сургучного цеха – контора** (здание неустановленного назначения) | 350/С-99284 | 1070,7 | 38 |
| Составные части и принадлежности: пять пристроек | | | |
| **Здание будки контрольной** (здание нежилое) | 350/С-197487 | 52,9 | 38/9 |
| Составные части и принадлежности: две беседки | | | |
| **Здание скважины** (здание нежилое) | 350/С-166125 | 17,8 | 38/2 |
| Составные части и принадлежности: забор, ворота | | | |

***В состав лота входит оборудование:*** кран-балка (инв. № 5226), тельфер грузоподъемностью 3,2 т (инв. № 237), котел водогрейный КВ-80 (инв. № 6057), цистерны 10 т – 4 шт. (инв. № 2421, 2422, 2494, 2495), цистерна 4,5 т. (инв. № 496)

***Сведения о земельном участке:*** пл. **2,4429** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 579 367,07 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минск), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| Срок подписания договора купли-продажи | **10** рабочих дней после проведения аукциона |
|---|---|

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **60 (шестидесяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 24.08.2021 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 20.08.2021 до 17.00** по указанному адресу

**Тел.: +375 17 280-36-37; 8044-704-92-06.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

---

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2021.Б.002.00026**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении первых повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего обществу с ограниченной ответственностью «Гипспромресурс», УНП 810001131, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 169-11Б/2015 в экономическом суде Гомельской области.

Номер лота, вид выставляемого на первые повторные электронные торги имущества:

**Лот № 1. Недвижимое и движимое имущество. Информация о предмете торгов, в т. ч. место нахождения:**

- Капитальное строение с инвентарным номером 310/С-10670, расположенное по адресу: Гомельская область, г. Гомель, ул. Химзаводская, д. 5, площадь – 8625,9 кв. м, назначение – здание специализированное для производства строительных материалов, наименование – здание кирпичного цеха, административно-бытовой корпус ЦКК (инв. № 9600002, 9610002), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 340100000005006024, площадью 1,9197 га. Составные части и принадлежности: подвал, четыре пристройки, дымовая труба (кирпичная, высотой 30 м, площадь застройки 29 кв. м, инв. № 9600005), ограждение (железобетонное в железобетонных стаканах, длиной 324,4 м, высотой 2,32 м, инв. № 9600004), автодороги (асфальтобетонное покрытие по щебеночному основанию, площадь 2536 кв. м, инв. № 9600003), две площадки (асфальтобетонное покрытие по щебеночному основанию, площадь 8162 кв. м, инв. № 9600200, бетонные плиты, площадь 4319 кв. м, инв. № 9600192).
- Капитальное строение с инвентарным номером 310/С-18687, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Химзаводская, 5, площадь – 34,1 кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание склада масел, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 340100000005006024, площадью 1,9197 га.
- Ворота механические металлические
- Внутриплощадочные сети связи
- Внутриплощадочные сети канализации и водоснабжения керамические (инв. № 9600007)
- Внутриплощадочные сети газоснабжения
- Внутриплощадочный теплопровод
- Внутриплощадочные кабельные сети в алюминиевой оболочке;
- Электропроводка силовая до 10КВ (инв. № 9600013)
- Трансформатор силовой масляный мощностью 630 кВА (трансформаторная подстанция 2КТП-630, инв. № 9600015)
- Пункт распределительный ПР 24-3104 (инв. № 9600017)
- Пункт распределительный ПР 24-7210 (инв. № 9600018)
- Пункт распределительный ПР 24-710 (инв. № 9600019)
- Таль ТЭ-521 (инв. № 443414)
- Кран мостовой грейферный (инв. № 9600119) (далее – имущество).

Местонахождение имущества: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Химзаводская, 5.

Движимое имущество бывшее в употреблении.

**Начальная цена:** 2 242 287,00 бел. руб. без учета НДС (освобождение от уплаты НДС согласно п. 2.30.2 ст. 115 НК РБ).

**Минимальная цена:** 2 242 287,00 бел. руб. без учета НДС.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Имеющиеся обременения: имущественные права на сооружения не зарегистрированы в установленном порядке. Государственная регистрация создания сооружений осуществляется в установленном порядке по заявлению покупателя на основании договора купли-продажи, решения собрания или комитета кредиторов об одобрении порядка и сроков продажи соответствующего имущества, технических паспортов, составленных по заявлению покупателя, и передаточных актов.

**Дата и время начала и завершения первых повторных электронных торгов: 04.08.2021 с 9.00 до 16.00.**

Первые повторные электронные торги проводятся на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу http://etpvit.by.

Прием документов осуществляется на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by с 9.00 20.07.2021 по 16.00 03.08.2021.

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до 16.00 03.08.2021.

**Задаток по лоту № 1** в сумме 224 228,70 (двести двадцать четыре тысячи двести двадцать восемь рублей 70 копеек) должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК MTBKBY22.

Победителем первых повторных электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан заключить договор купли-продажи не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов; оплатить стоимость приобретенного имущества в соответствии с договором купли-продажи не позднее 30 дней со дня проведения электронных торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов; возместить затраты на организацию и проведение торгов, оплатить затраты на обслуживание ЭТП.

**Справочная информация**

Контактный телефон антикризисного управляющего +375 (44) 7224795.

Контактный телефон для осмотра объектов +375 (44) 7224795.

Контактные телефоны лица, организующего торги на основании договора поручения: +375 (212) 482011, +375 (29) 8849679.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов (информацией о предмете электронных торгов – в отношении нематериальных активов) с 20.07.2021 по 03.08.2021 с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию по месту нахождения имущества.

Затраты на организацию и проведение первых повторных электронных торгов определяются согласно смете затрат и прейскуранту ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение первых повторных электронных торгов производится на http://etpvit.by до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

---

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н.М. извещает о проведении 16 августа 2021 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 311/С-181** общей площадью **58,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **КПП. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4. **Изолированное помещение с инв. № 311/D-8627** общей площадью **1 226,7 кв. м,** назначение – административное помещение, наименование – **помещение здания конторы. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-1. **Изолированное помещение с инв. № 311/D-9721** общей площадью **2 087,5 кв. м,** назначение – помещение транспортного назначения, наименование – **производственный корпус № 2254. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-2. **Капитальное строение с инв. № 311/С-30617** общей площадью **0,0 кв. м,** назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **хозфекальная канализация. Капитальное строение с инв. № 311/С-30619**, общей площадью **0,0 кв. м**, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **водопровод. Адрес:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4-2. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **321250100003002034**, общей площадью **0,8513 га (право постоянного пользования). Местонахождение:** Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Полевая, 4 | **157 594,00** | 15 759,40 | 15 759,40 |
| 2 | **Шкаф РУ-1** (металлический шкаф шир. 70 см. выс. 120 см), инв. № 156. **Шкаф КТК-05-03** (металлический шкаф шир. 110 см, выс. 150 см), инв. № 157. **Котлоагрегат Е1/9,** инв. № 164. **Панель вводно-распределительная ЩО-70 (Электрощит ЩО-7),** инв. № 170. **Панель вводно-распределительная ЩО-70 (Электрощит ЩО-7),** инв. № 171. **Электрощит TDM ELECTRIC**, инв. № 169. **Водоподготовка ВУ-3А-1** (металлическая емкость диам. 1,2 м, дл. 3,0 м), инв. № 165. **Водоподготовительная установка ВПУ-3,** инв. № 172. **Трансформатор тока тип ТК-20,** инв. № 173/18346. **Трансформатор тока тип ТК-20,** инв. № 174/35380. **Трансформатор тока тип ТК-20,** инв. № 175/370322. **Трансформатор тока ТОП-0,66-1,** инв. № 176ч/171620. **Станок токарный 1К625,** инв. № 188/12530. **Лесопильная рама Р-63,** инв. № 371-1/14036. **Ленточнопильный станок MG 6500,** инв. № 839. **Станок многопильный ЦМ 150К,** инв. № 840/299. **Грузовой специальный автокран МАЗ 53373 1 КС-3579-3,** 2009 года выпуска, **рег. знак АК 8648-3,** идентификационный номер (номер кузова, рамы) Y3M53373180000050, Y3M35790390000797. **Местонахождение:** г. Буда-Кошелево, ул. Техническая, 11; г. Чечерск, ул. Советская, 42; г. Корма, ул. Рогачевская, 21 | **20 989,00** | 2 098,90 | 2 098,90 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

**Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости – Яроцкая Людмила Николаевна.

**Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»)**: р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления);

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 20 июля 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 12 августа 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).**

Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)», ст. 127–129.

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 12.02.2021 г. № 27(29396). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by.**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.**

---

### РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДСТ-1, г. Витебск» (продавец)

### ЛОТ № 1: АСФАЛЬТОСМЕСИТЕЛЬНАЯ УСТАНОВКА LINTEC

**контейнерного типа CSD 2500/5/50 В, 2013 года выпуска, зав. № 2013-05, инв. № 2225. Технический паспорт CSD 2500/5/50В 00.00.000 ПС.**

**Адрес:** Украина, Николаевская область, г. Новый Буг.

**Обременение:** аренда.

**Начальная цена с НДС** – 666 000,00 евро.

**Задаток** – 400 000,00 руб. **Штраф** – 200 000,00 руб.

Аукцион состоится **30.07.2021 в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **28.07.2021 в 11.00.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

Кожны трэці

# «...НЕ ДАЗВОЛЬЦЕ ВАЙНЕ ПАЎТАРЫЦЦА...»

## Магілёўскі пісьменнік Алесь КАЗЕКА пра сямейную трагедыю і веру ў Бога

**Летась у Борках быў пабудаваны вялікі мемарыял у памяць тых, хто 15 чэрвеня 1942 года жывымі былі спалены нацыстамі падчас адной з самых буйных за гады Вялікай Айчыннай вайны карных аперацый. У той дзень ахвярамі нелюдзяў сталі больш чым 2000 мірных жыхароў гэтай і іншых вёсак. У жывых засталіся адзінкі, у тым ліку маці старшыні Магілёўскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Алеся Казекі — Марыя Восіпаўна Дайнека. Некалькі гадоў таму ён напісаў паэму «Марыйка», якую прысвяціў трагедыі сваёй маці. Сёння цытаты з яе можна прачытаць на сцяне ў доме-музеі мемарыяльнага комплексу. Яны размешчаны побач з фатаграфіямі людзей, якія жылі ў Борках да вайны, і назвамі вёсак Кіраўскага раёна, поўнасцю або часткова знішчаных карнікамі.**



**Выгадаваўшы пяцярых дзяцей, Марыя стала манахіняй.**

### Раніца 15 чэрвеня 1942 года...

— Пра гэтую трагедыю ў сям'і не было прынята гаварыць, але яна існавала і не давала супакоіцца, — расказвае Алесь Мікалаевіч. — Маці ніколі не расказвала ўсю гісторыю цалкам, так, невялікімі кавалачкамі. З іх потым і нарадзілася паэма. У матулінай сям'і было каля дзесяці дзяцей, але на пачатку вайны засталіся толькі чацвёра: Мікалай, Вольга, Шурка і Марыя — мая маці.

Наста Дайнека, маці Марыйкі, яе сястры і братоў, памерла перад вайной — у 1939 годзе. Бацька Восіп паспеў яшчэ раз ажаніцца, але вясной 1942 года таксама памёр. Старэйшая сястра Марыйкі Вольга была замужам і жыла ў Борках — за 10 кіламетраў ад бацькоўскай хаты, якая знаходзілася ў Новым Юзіне. Браты Мікалай і Шурка пайшлі ваяваць. Мікалай быў танкістам і прапаў без вестак падчас абароны Магілёва, а Шурка трапіў у палон, збег і вярнуўся дахаты. У той дзень, калі ў Боркі прыйшла бяда, Шурка забег да Вольгі, каб развітацца і разам з сябрамі пайсці ў партызаны. Выйсці з вёскі ў яго ўжо не атрымалася. Муж Вольгі напярэдадні адправіўся з канём у суседнюю вёску на заробкі. Толькі гэта яго і выратавала ад страшнай смерці. Вольга заставалася разам з малымі дзецьмі і чакала малодшую сястру Марыйку. Яна павінна была раніцай прыбегчы да яе. Вольга хацела прапанаваць ёй перабрацца жыць да яе. Нельга было заставацца маладой дзяўчыне адной у хаце пасля смерці бацькі. Мачаха, як толькі пахавалі гаспадара, збіралася вярнуцца да сваіх. Раніцай 15 чэрвеня Марыйка пайшла па Юзінскім (Збушынскім шляху да сястры. Яна амаль дайшла да Борак, але прыпыніў немец. Яна адчула пах дыму і стрэлы, нешта жахлівае адбывалася там, дзе знаходзілася яе сястра і пляменнікі. Але немец падымаў на яе зброю і крычаў незразумелае: «Halt! Man darf nicht! Zuruck!» (Стой! Нельга! Назад!) Ужо потым яна даведалася, што сярод тых больш чым 2000 чалавек, спаленых жывымі, былі яе Шурка і Вольга з дзецьмі. У той момант ёй падалося, што час прыпыніўся...

### Вяртанне да жыцця

*Мама, мамачка,*
*страшна і сумна,*
*Што няма цябе побач*
*са мной.*
*Мама, мамачка, страшна*
*і сумна*
*Заставацца на свеце*
*адной...*

Жах, боль, адчай — сэрца, здавалася, рвалася на часткі. А ў галаве гучала як прысуд: адна, на ўвесь свет адна. Але, напэўна, з генамі ёй перадалося ад бабкі, якая верыла ў Бога, разуменне, што яна невыпадкова засталася на зямлі. Што яна цяпер адзіная захавальніца роду і яго прадаўжальніца. А дзеля гэтага трэба жыць. Вёску тройчы бамбілі, дом у Новым Юзіне, дзе жыла Марыя, згарэў, і яна перабралася ў зямлянку. Так і жыла сярод балот, паблізу ад вядомых партызанскім рухам клічаўскіх лясоў. Вёсачка Новы Юзін знаходзілася на стыку трох раёнаў — Кіраўскага, Клічаўскага і Быхаўскага. Знайшліся добрыя людзі, якія дапамаглі перажыць цяжкія хвіліны. Разам яны хадзілі на богаслужэнні ў найбліжэйшыя вёскі Брылёўка і Доўгае. Там яна і пазнаёмілася са сваім будучым мужам Мікалаем, з якім нарадзіла пяцярых дзяцей. Нельга казаць, што іх пасляваеннае жыццё было спакойным і ціхім. У 1959 годзе згарэў дом, які сваімі рукамі пабудаваў Мікалай. Асабліва Марыя шкадавала, што ў агні загінулі старадаўнія малітоўныя кнігі. Але добра, што і самі, і дзеці засталіся цэлыя. Мікалай пачаў будаваць новы дом, але грошай, каб яго скончыць, не хапіла. Незавершаны будынак прадалі, а атрыманых за яго грошай хапіла на маленькі стары домік. Ён быў вельмі цесны для вялікай сям'і, але іншых варыянтаў не было. Радні амаль ніякай, дапамагаць няма каму. З блізкіх толькі маці Мікалая. Бацька вярнуўся з фронту, але хутка памёр. Дом, які Мікалай не дабудаваў, потым стаў школай, у якую хадзілі і дзеці Марыі і Мікалая.

### Забароненая тэма

Марыя ні на хвіліну не забывала тую трагедыю. Назвала старшую дачку ў гонар сястры Вольгі, а сына — Шурка, Алесь. Дзеці раслі, а з узростам расла і іх цікавасць да жахлівай падзеі ў Борках.

— Аднойчы ў сярэдзіне семідзясятых мы паехалі ў Колбава, хацелі знайсці Сцяпана — мужа Вольгі, — расказвае Алесь Мікалаевіч. — Ён там жыў з другой сям'ёй. Але, на жаль, так і не сустрэліся. Сам ён пазбягаў сустрэч з маці. Яна была вельмі падобная на сваю старшую сястру і нагадвала пра страшную страту.

Да балючай тэмы Алесь вяртаўся яшчэ некалькі разоў, ездзіў у Боркі, шукаў сведак. Але што яны маглі расказаць? Аднойчы дзяцей вельмі напалохала маці. У іх на Друці адпачывалі нямецкія студэнты, смяяліся, пра нешта гаманілі. Жанчына пачула чужынскую мову і кінулася на кампанію з крыкамі: забойцы. Яе тады ледзь адцягнулі. Сын потым яшчэ доўга супакойваў маці. Казаў, што не ўсе немцы былі выродкамі. Меліся сярод іх і прыстойныя людзі. Дзякуючы аднаму з іх яна і засталася жывой.

— Мая цешча ўспаміналa, што, калі карнікі палілі вёску Студзёнку ў Быхаўскім раёне, у ачапленні стаялі мясцовыя паліцаі, — успамінае Алесь Мікалаевіч. — Міма іх ішлі маладыя дзяўчаты, якія не ведалі, што адбываецца на іх шляху. Паліцаі з імі пагутарылі, пасмяяліся і нават не папярэдзілі, каб яны туды не ішлі. Нелюдзі, адным словам.

### Другое жыццё Марыйкі

Так атрымалася, што паэма пра сямейную трагедыю з'явілася ўжо пасля таго, як з жыцця пайшлі бацька і маці. Алесь Казека пісаў яе на сваёй дачы ў Чачэвічах на беразе неабсяжнага Чыгірынскага вадасховішча. Рабіў там рамонт, але думкі былі далёка. Паэтычныя радкі быццам бы дасылаліся аднекуль. Часам нават здавалася, што не Марыйка, а ён бяжыць да Вольгі па Юзінскаму шляху. Рука запісвала словы, і яны здзіўлялі. У іх не было абвінавачванняў, яны, наадварот, давалі сілы.

— Гэта паэма не пра смерць, — кажа суразмоўца. — Гэта — паэма-перадольванне. Зусім яшчэ маладая дзяўчынка, лічы, дзіцё, пастаўлена ў нечалавечыя ўмовы: вайна, усіх спалілі, і яна з гэтым болем адна. Што рабіць, каб не зламацца? Шлях адзін — да Бога. Гэта дала ёй сілы і замуж выйсці, і пяцярых дзяцей паставіць на ногі, а потым і манаства прыняць. Бацькі прынялі такое рашэнне, калі мы ўсе з'ехалі з дому. Калі абодва сужэнцы прымуць рашэнне ісці да Бога, шлюб лічыцца несапраўдным. Яны жылі як два манахі — брат і сястра. Бацька прыняў свяшчэнства і стаў іераманахам Феадосіем. Дом у Чачэвічах, дзе яны жылі, быў асвечаны як Пакроўскі храм. Бацька памёр ад анкалогіі ў 2008 годзе, маці — ад цукровага дыябету двума гадамі раней.

### Каб памяталі

Летась «Марыйка» моцна прагучала ў выкананні навучэнцаў Магілёўскага каледжа мастацтваў са сцэны Дня беларускага пісьменства ў Бялынічах. Гледачы не хавалі слёз, перажываючы тыя падзеі. Нават сам аўтар быў у роспачы.

— Калі пісаў, было балюча, бо прыйшлося ўсё прапусціць праз сябе, — прызнаўся ён. — Але пасля прагляду «Марыйкі» на сцэне, перажыў яшчэ адно моцнае ўзрушэнне.

— Калі мы азнаёміліся з гэтым матэрыялам, зразумелі, што проста так чытаць нельга — ён абавязкова павінен быць увасоблены праз пластыку, — расказвае **выкладчыца тэатральных дысцыплін Магілёўскага каледжа мастацтваў Алена ЯРАШУК.** — І патрапілі ў цэль. Па меры таго, як мы саспявалі ў гэтым матэрыяле, мы ўлюбляліся ў яго. Там жывое слова і нешта даступнае простаму разуменню. Мы ўжо шмат дзе яго паказвалі. Пабывалі на мемарыяльным комплексе, бачылі той калодзеж, дзе тапілі дзяцей, бэлькі спаленай хаты. Дзеці прасякнуліся гэтым так, што зараз аддаюцца пастаноўцы цалкам. Кожны раз мы адкрываем для сябе нешта новае. Такі матэрыял вельмі патрэбны сёння і моладзі, і людзям сталага ўзросту. Такія рэчы нельга забываць. Чалавек прыходзіць у свет, каб жыць у гармоніі, любові і прыгажосці. І гэта апавед пра любоў. Чалавек нарадзіўся ў любові і для любові. Калі б Марыйка не перажыла трагедыю, магчыма, яна не так любіла б. Пасля гэтай паэмы я палюбіла ў беларускую мову. Якая ж яна ў нас пявучая, ласкавая, трапяткая і вельмі зразумелая.

Сёлета на Дзень Перамогі музычна-літаратурную пластычную кампазіцыю можна было ўбачыць на сцэне Магілёўскага абласнога драмтэатра. Тэатр падтрымаў сваіх пачынаючых калег, і «Марыйка» ў прафесійным афармленні стала яшчэ больш яркай і пранізлівай.

— Кожны паказ гэтай музычна-літаратурнай пластычнай кампазіцыі — асобная гісторыя, — прызнаецца **галоўны адміністратар Магілёўскага абласнога драмтэатра Аляксей НАЯРОВІЧ.** — Я чытаю асноўны тэкст і заўсёды вельмі перажываю. Цяжка бывае стрымліваць эмоцыі. Паэма «Марыйка» — уладальніца Гран-пры абласнога конкурсу «У далонях маёй Беларусі» — яе ўбачыць уся вобласць. І вельмі прыемна, што гэты паказ стартаваў менавіта з драмтэатра. Бо гэтая зала, сцэнічнае афармленне, сама сцэна здольны перадаць усю глыбіню пастаноўкі.



**Кожны паказ музычна-літаратурнай пластычнай кампазіцыі «Марыйка» — асобная гісторыя.**

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з сямейнага архіва Алеся Казекі.**

**Уладальнік Ружанаў здабыў гетманскую булаву праз жончыну прыгажосць**

# СЯМЕЙНЫЯ ТАЯМНІЦЫ ВАЯВОДЫ ПОЛАЦКАГА

Цемнавокі чалавек, яшчэ малады, з крыху адвіслымі капрызлівымі вуснамі, сціскае знізанай пярсцёнкамі рукой пазалочаны падлакотнік фатэля і нервова прыслухоўваецца: ці не пад'ехала да палаца карэта, ці не вярнулася яе княская мосць пані Магдалена Агнешка, у дзявоцтве Любамірская? Вось, здаецца, грукочуць па брукаванцы колы, стукаюць падковы, бразгаюць дзверы... А вось і абцасікі атласных туфлікаў спяшаюцца па паркеце...

— Ну што, удалося? Граф паабяцаў?

Маладая кабета, гожая, беласкурая, пышнацелая, у французскім шаўковым раброне цаной, мабыць, у цэлую карэту, на нецярплівае пытанне сужэнца толькі лянiва пацепвае агаленымі плячыма.

— Няхай не пераймаецца залішне вашая княская мосць, будзе пан гетманам польным літоўскім...

І дадае паблажліва:

— Падчас наступнага візіту да ягамосці сына графа Бруля я нагадаю пра гэтае абяцанне.

Ваявода полацкі Аляксандр Міхаіл Сапега з палёгкай уздыхае і пачціва раскланьваецца з жонкай. Цяпер можа вярнуцца да ўлюбёнага музіцыравання... Палітыка ёсць справай сумнай і няпэўнай, але як без яе спраўдзіць свае амбіцыі?

Так і ўявілася гэтая сцэнка, калі чытала ў кнізе Адама Мальдзіса выгрымку з мемуараў Марціна Матушэвіча, нясвіжскага пісара: *«Полацкі ваявода Аляксандр Сапега даў графу Брулю, правай руцэ караля Аўгуста III, дваццаць тысяч чырвоных злотых, каб той «выстараўся» для яго «булаву польнага літоўскага гетмана». Але гэтага аказалася мала. Тады «сама полацкая ваяводзіна, будучы прыгожай і маладой, ахвяравала графу Брулю свае фаворы, і кажуць, што сын Бруля, генерал каронный артылерыі, выкарыстаў гэтыя фаворы».*

Давайце ж бліжэй пазнаёмімся з героямі гістарычнага анекдота.

## З залатой лыжкай у роце

Аляксандр Міхаіл быў вынікам саюзу двух наймагутнейшых родаў: бацька — ваявода берасцейскі Казімір Лявон Сапега, маці — Караліна Радзівіл. Старэйшы сын — вядома, галоўны спадчыннік, пястун лёсу... Але калі Аляксандру было восем, бацька памёр. А маці ў хуткім часе пазбавілі права апекі, бо праз два гады, як аўдавела, яна выйшла замуж за Юзафа Ябланоўскага. І... адпісала яму ўсе маёнткі, і свае, і дзяцей (у Аляксандра была старэйшая сястра, Ганна Паўліна, і два браты). Такім чынам княгіня Караліна фактычна пазбаўляла дзяцей спадчыны — бо іначай, паводле тастамента, амаль усё маёнткі мусілі адысці менавіта ім пасля паўналецця.

Зразумела, усчаўся скандал. Як пішуць гісторыкі Ірына Масляніцына і Мікола Багадзяж, «у рэшце рэшт уся Рэч Паспалітая аказалася падзеленая на два лагеры. Адны падтрымлівалі Радзівілаў, другія — Сапегаў. На чале апошніх паўстаў стрыечны дзядзька Ганны Паўліны, каад'ютар віленскі Юзаф Сапега. Супрацьстаянне цягнулася амаль два гады і скончылася ў снежні 1741 года».

Ябланоўскі надоўга звёз знерваваную жонку ў падарожжа па Еўропе. Гаспадыняй у адваяваных у айчыма сапегаўскіх уладаннях засталася непаўналетняя сястра Аляксандра Ганна Паўліна. А апекуном Аляксандра стаў згаданы дзядзька, віленскі каад'ютар, то-бок намеснік біскупа, Юзаф Сапега. І ў тым жа годзе дзесяцігадовы Аляксандр Міхаіл пры дапамозе дзядзькі робіцца пунькаўскім старастам. І надалей пасады дастаюцца спадчынніку роду адна за адной. У шаснаццаць яго абіраюць паслом на сейм, у васямнаццаць ён ужо кіруе



палком, у дваццаць чатыры — становіцца ваяводай полацкім. Гэтай пасады, дарэчы, беспаспяхова дамагаўся яго бацька.

## На што не пойдзеш дзеля булавы...

Сапраўды лёсавызначальным быў шлюб з Магдаленай Агнешкай з Любамірскіх. Аляксандру Сапегу было 27, Магдалене — 18. Але яна паспела ўжо пабываць замужам — за далёкім сваяком Юзафам Любамірскім. У чэрвені было вяселле, у жніўні Юзаф памёр. Праз два гады Магдалена Агнешка стала Сапегай.

Аляксандр Міхаіл не быў ні ваяўнічы, ні хітрамудры. Калі папраўдзе, дык лічылі яго сучаснікі не вельмі кемным. Меў князь схільнасць да мастацтва — музыкі, малявання. Падобна да дзядзькі Юзафа, стаў бібліяфілам — вядома, што калі яму было дзевятнаццаць, віленскі гравёр Францішак Бальцэвіч зрабіў для яго два экслібрысы. Аляксандр сабраў цэлую карцінную галерэю... Пераклаў на польскую мову Цыцэрона і выдаў у Вільні «на карысць шляхецкай моладзі, якая вучыцца ў дзярэчынскім пансіёне». Пры гэтым быў задужа ціхмяны для свайго статусу.... Так што жонка-рухавік была вельмі дарэчы... Бо каб зрабіць у той час кар'еру, зусім не абавязкова было мець таленты. У часы Аўгуста III Саксонца, які нават моў сваіх падданых не ведаў і, атлусцеўшы, займаўся тым, што выразаў у сваіх пакоях папяровых чалавечкаў, пасадамі і нават патэнтамі на шляхецтва шырока гандлявалі. Асаблівa тыя, хто быў у фаворы ў караля, а найперш — граф Генрых Бруль, які пачынаў пажам яшчэ пры двары бацькі сённяшняга караля. Вось да яго вабная пышнацелая Магдалена Сапега і скіравалася... Бо надта ж загарэлася Аляксандр Сапегу стаць гетманам польным літоўскім! Пасада якраз вызвалілася, была трохі ніжэйшая за вялікага гетмана. Але прэстыжная! Ваяка з Сапегі быў ніякі, а булавы хацелася. Так што гатовы быў узамен прапанаваць вабноты жонкі.

На той час сам граф Бруль быў ужо ва ўзросце, таму дагаджала Магдалена яго сыну Алаізію.

І выстаралася-такі ваяводзіна для сужэнца булавы! Хоць шляхта здзекавалася: куды гэтаму сібарыту кіраваць войскам!

## То на адзін бок, то на другі

А далей пачаліся палітычныя мітрэнгі... Партыя Чартарыйскіх прасоўвала на трон свайго стаўленіка, Станіслава Аўгуста Панятоўскага, фаварыта расійскай царыцы. Радзівіл Пане Каханку таксама меў каралеўскія амбіцыі... Аляксандр Сапега пераходзіў то на адзін бок, то на другі — глядзячы куды сваякі папхнуць. Калі выбіралі яго ў 1756-м ваяводам полацкім, быў ён прадстаўніком Фаміліі, палітычнай групоўкі Чартарыйскіх. Як піша гісторык Андрэй Мацук, «не ўсе магнаты ВКЛ былі згодныя з кандыдатурай на ўрад полацкага ваяводы Аляксандра Сапегі. Галоўнымі праціўнікамі былі Радзівілы, якія супрацьстаялі Фаміліі...» І каб вы разумелі, як тады вырашаліся інтрыгі: Юзафу Сапегу давялося выдаткаваць на абранне пляменніка ваяводам чатыры тысячы чырвоных злотых, уклаўся і сам Аляксандр, запазычыўшы ў каго мог. Было паслана ў Полацк 10 бочак венгерскага віна, мёд і гарэлку закупілі ў полацкіх езуітаў, якія славіліся такой прадукцыяй, а яшчэ адправілі воз шабель і шапак для раздачы шляхце.

Нейкі час Аляксандр Сапега падтрымліваў Радзівіла Пане Каханку — пакуль не пасварыўся з тым з-за жонкі... Потым падтрымаў абранне Панятоўскага. Калі пачалася Барская канфедэрацыя — рокаш шляхты супраць новага караля, Аляксандр Сапега таксама доўга вагаўся... Ягоная сястра Ганна Паўліна Ябланоўская была такой актыўнай канфедэраткай, што яе празвалі «мадам дэ Бар». Частка войска Сапегі таксама перайшла пры ягоным папушчальніцтве на бок канфедэратаў... Потым гетман польны перайшоў на бок караля. Некаторыя гісторыкі кажуць, каб Сапега рашуча падтрымаў са сваім войскам барскіх канфедэратаў, гісторыя магла б пайсці іншым шляхам.



Але кароль паабяцаў булаву вялікага гетмана...

Міхаіл Казімір Агінскі, які займаў гэтую пасаду, знаходзіўся пасля паразы канфедэратаў у Парыжы. Страшэнна абурыўся, даведаўшыся, што ягоная булава абяцана Сапегу, калі вярнуўся на Радзіму, нават выклікаў таго на двубой. Эпічную бойку двух магнатаў прадухілілі, калі паабяцалі Аляксандру Сапегу «вялікую літоўскую пячатку» — пасаду літоўскага канцлера.

Як і чакалася, і канцлер з Сапегі атрымаўся ніякі. На сеймы не хадзіў, падпісваў, што казалі...

## Ва ўцёках ад каралеўскага рамана

Была важкая прычына саюзу Сапегі са Станіславам Панятоўскім. Справа ў тым, што Магдалена Агнешка Сапега з Любамірскіх пяшчотна сябравала з каралём. Яшчэ да ягонага абрання, як піша Матушэвіч, мела «пачуцці да літоўскага стольніка Панятоўскага». Той быў аматарам жаночага полу, але чароўная Магдалена заняла трывалае месца ў ягоным сэрцы. Кароль нават прызначыў ёй тры тысячы дукатаў гадавой пенсіі, нягледзячы на абурэнне прыбліжаных. Магдалена зязла дыяментам на каралеўскіх балях, іграла ў прыдворным тэатры пад псеўданімам «Магдалена Сапежына». І хоць Аляксандр Сапега быў не супраць карыстацца ўплывам жонкі на ўладных мужчын, кпіны шляхты яго закранаі. У 1765—1771-м ён нават жыў асобна ад Агнешкі. А тая за гэты час... нарадзіла каралю дваіх дзяцей, Міхаіла і Канстанцыю Цікоцкіх, якія былі аддадзены на выхаванне ў дом варшаўскіх купцоў Пятра і Дароты Петэрсаў. Як сцвярджае польская гісторык Марыя Чэпе, Магдалена Агнешка плаціла за іх выхаванне да самай сваёй смерці.

У 1772 годзе Магдалена Агнешка нарадзіла сына Францішка, які афіцыйна лічыўся сынам Аляксандра Сапегі. Але Сапега вельмі доўга не хацеў прызнаваць Францішка сваім дзіцем. Але ўрэшце прызнаў... Бо, як паблажліва заўважаў кароль, без сваёй жонкі нічога не значыў.

Што ж, усё залежыць ад таго, наколькі пашанцавала чалавеку ў супадзенні прыродных уласцівасцяў з тым, чым ён мусіць займацца. У выпадку з Аляксандрам Сапегам супадзенняў было мала... Займаў пасады — кіраваць не хацеў, узначальваў войскі — ваяваць не ўмеў... Але хіба мяккасць і міралюбнасць, якімі яго папракалі, такія ўжо дрэнныя якасці? У палітычнай сатыры таго часу Сапега паказаны як «гнюсны сібарыт». Як піша гісторык Мікола Пракаповіч, *«адныя даследчыкі сцвярджаюць, што А. Сапега не вызначаўся высокай мараллю, ганьбіў маладых дзяўчат і меў пазашлюбных дзяцей, вельмі жорстка ставіўся да сваіх сялян і падаўляў іх бунты. Існуе легенда аб яго незаконнанароджаным сялянскім сыне Ніле, які падняў сялян на змаганне за лепшае жыццё і быў за гэта разам са сваімі прыхільнікамі пакараны смерцю. Астатняя частка сялян-бунтаўшчыкоў была выселена ў асобнае паселішча, якое сталі называць Варанілавічы — месца, дзе жывуць «варынілаўцы» (сяляне, што падтрымлівалі бунтаўшчыка-«вора» Ніла). Другія сцвярджаюць, што Аляксандр быў асобай неардынарнай, адукаванай і высокамаральнай».*

Аляксандр Сапега захапляўся дакладнымі навукамі, асабліва хіміяй, аднойчы спусціўся ў ртутныя шахты Славеніі за пробамі ртуці. Рыхтаваў падручнікі па хіміі і мінералогіі. Рэпутацыю баязліўца абвяргае і той факт, што ён займаўся альпінізмам і скараў вяршыні Альпаў. Дарэчы, выдаў кнігу на французскай мове пра свае падарожжы па Грэцыі, Аўстрыі і Турцыі. У Ружанах і Дзярэчыне, дзякуючы яму, існавалі выдатныя тэатры, дзейнічала самая вялікая ў Рэчы Паспалітай музычная, оперная і балетная школа, бралі туды і дзяцей прыгонных сялян. Самых таленавітых адпраўлялі вучыцца ў Італію. А згодна з тастаментам, пасля смерці гаспадара ўсе прыгонныя артысты Ружанскага тэатра, балета, аркестра атрымалі волю.

Займаўся канцлер і гаспадаркай: у Ружанах заснаваны фабрыкі *«аднатонных, а таксама ў кветкі і ўзоры шаўковых тканін, паясоў, адамашкавых шпалераў, аксамітаў, сукон, абрусаў на самыя вялікія сталы з рознымі ўзорамі і гербамі, зяючых свечак, карэт і пакрытых лакам павозак»*. Як піша ў мемуарах Лявон Патоцкі, *«пад канец праўлення Станіслава Аўгуста Панятоўскага князь Аляксандр Сапега, канцлер Вялікага княства Літоўскага, выбудаваў у Дзярэчыне праcторны дом, прызначаючы яго пад навуковую ўстанову для трыццаці сыноў заслужаных вайскоўцаў. Сумныя абставіны ў краі не дазволілі магнату давесці такі шляхетны намер да канца».*

Памёр Аляксандр Сапега ў 1793 годзе, пахаваны ў Бярозе-Картузскай. Магчыма, там жа была пахавана і няверная яго жонка Магдалена Агнешка, якая памерла ў 1780-м.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

# ВАКОЛІЦЫ НАТХНЕННЯ ТВОРЦАЎ

**Мастацка-дакументальная выстава «Максім Багдановіч і Генадзь Чысты. Крыніца натхнення» адкрылася нядаўна ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча. Сёлетні год багаты на святочныя даты ў багдановічазнаўстве, бо ў 2021-м адзначаецца 130-годдзе з дня нараджэння беларускага класіка, 40 гадоў таму быў створаны музей паэта ў сталіцы, а таксама 30 гадоў таму адкрылася экспазіцыя ў мемарыяльным музеі «Беларуская хатка».**

Не менш важная падзея ў жыцці Максіма Багдановіча адбылася і ў 1911 годзе — першая пасля доўгага расстання сустрэча з радзімай, калі паэт некалькі месяцаў жыў у фальварку Ракуцёўшчына пад Маладзечнам. Гэты перыяд стаўся плённым для класіка: ён напісаў цыклы вершаў «Места», «Старая Беларусь», паэмы «У вёсцы», «Вераніка». Пазней яго аднакласнік і найлепшы сябар Дзіядор Дзяболь-скі ва ўспамінах пісаў, што «толькі пасля гэтай паездкі Максім адчуў і зразумеў, што ён сапраўды беларускі паэт». Варта адзначыць, што напрыканцы ліпеня ў мемарыяльным музеі Максіма Багдановіча «Фальварак Ракуцёўшчына» традыцыйна пройдзе свята паэзіі і песні. Хэдлайнерам свята стане заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Свята», які прадставіць сваю праграму. Таксама ўдзел прымуць паэты і пісьменнікі, музычныя калектывы з Маладзечаншчыны.

А напярэдадні прыхільнікам творчасці паэта прапануюць натхніцца перад будучай сустрэчай, пазнаёміўшыся з тымі мясцінамі праз мастацкія работы і фотаздымкі Генадзя Чыстага. Імя гэтага чалавека на слыху ў многіх, паколькі Генадзь Рыгоравіч спрычыніўся да стварэння многіх музеяў, музейных экспазіцый, у прыватнасці прысвечаных Максіму Багдановічу: ён аўтар мастацкай канцэпцыі першай экспазіцыі Дома-музея паэта ў Яраслаўлі, і яму належыць ідэя таго, які выгляд мае экспазіцыя музея ў Ракуцёўшчыне.

— Усе прадстаўленыя тут карціны і фотаздымкі я рабіў 22 гады таму. Стваралі мы «Дом арандатара», і я хадзіў там па ваколіцах і фатаграфаваў. Так тыя фотаработы і ляжалі да гэтай пары. Спачатку хацеў зладзіць сваю персанальную выстаўку, а ў выніку вырашылі зрабіць усё вось у такім фармаце, прымеркаваўшы да 110-годдзя сустрэчы Багдановіча з радзімай. І ў канцы ліпеня ў Ракуцёўшчыне свята будзе, — дзеліцца ўспамінамі **мастак Генадзь ЧЫСТЫ.** — Яшчэ тут можна ўбачыць дзесяць маіх эцюдаў. Дарэчы, клеці, якую мы можам пабачыць (на фотаздымку яе выгляд знутры, а на эцюдзе яна толькі будуецца), цяпер ужо няма, згарэла ў 2002 годзе. Таму, калі б не сфатаграфаваў тады яе, сёння б і не ведалі, як усё выглядала.



Той самы дзіцячы пакой, што з'явіўся на месцы спіжаркі.

Сярод фотаздымкаў ёсць магчымасць убачыць фрагменты з экспазіцыі «Дома арандатара» і «Дома гаспадара», якія даюць адчуванне атмасферы старога вяскового дома, гасціннасці яго гаспадара Вацлава Лычкоўскага, дазваляюць адчуць смак гарбаты, якой частавала Максіма пляменніца гаспадара Эмілія Шабуня. Між іншым, тут на адным з фотаздымкаў бачым дзіцячы пакой, дзе да гэтага быў зусім іншы антураж. Як распавяла **Ірына МЫШКАВЕЦ, вядучы навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Максіма Багдановіча,** у доме гаспадара на месцы дзіцячага пакоя павінна была быць спіжарка (кладоўка), і яе музейшчыкі меркавалі напоўніць экспанатамі — тыповымі прадметамі таго часу. А пасля ўжо адбыліся змены ў экспазіцыі, якія звязаны з гісторыяй 1911 года, калі паэт адпачываў на Ракуцёўшчыне, дзе была Эмілія Шабуня са сваёй маленькай дачушкай Янінай.

— Ва ўспамінах (іх Яніна пісала са слоў маці) прыгадваецца, як Багдановіч адносіўся да дзяцей. І ідэя Генадзя Рыгоравіча была ў тым, каб з улікам гэтай рысы са ўнесці змены ў экспазіцыю дома гаспадара. Дзіцячы пакой важны, для мяне асабіста ён раскрывае Максіма як чалавека, які імкнуўся да стварэння сям'і, дэманструе цеплыню яго стасункаў з дзеткамі. І гэта выдатна, калі навуковая і мастацкая часткі злучаюцца і дапаўняюць адна адну. І мы гатовы ісці на падобныя змены, калі сутнасна гэта апраўдана, — распавядае Ірына Вітальеўна. — Звычайна мы прыходзім з ідэяй да Генадзя Рыгоравіча і тлумачым, што нам хацелася б паказаць, якія акцэнты расставіць. А далей ужо пачынаецца творчасць. Ён прыслухоўваецца да нашых ідэй, але па-мастацку іх увасабляе. У музейных экспазіцыях Генадзь Рыгоравіч стаіць за асобай творцаў, а ў дадзеным праекце «Крыніца натхнення» нам захацелася яго самога адкрыць і паказаць аўдыторыі як творцу.

Сам мастак адзначае, што мець дачыненне да стварэння музеяў, экспазіцый, прысвечаных беларускім творцам, — гэта для яго вельмі цікавая справа, яна дае магчымасць увасабляць розныя, самыя смелыя, ідэі, а гэта для яго галоўнае ў любым праекце. Вось і выстава «Максім Багдановіч і Генадзь Чысты. Крыніца натхнення», якая дэманструе яго работы, пераносіць ва ўспаміны і самога мастака-афарміцеля, і вяртае ў часы Багдановіча, дае адчуванне імклівасці жыцця і яго непрадказальнасці. І пабуджае выдаткаваць час на паездку ў Ракуцёўшчыну, пакуль там яшчэ ўсё гэта захоўваецца...

Зладзіць уласнае падарожжа ў часе і наведаць выставу «Максім Багдановіч і Генадзь Чысты. Крыніца натхнення» ўсе ахвотныя змогуць да 13 жніўня.

**Алена ДРАПКО,**
**фота аўтара.**

# АРХІЎНЫ АЛЬМАНАХ: ПРАЦЯГ ТРАДЫЦЫІ

**Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва прадоўжыў выданне альманаха «Аўтограф». Толькі што ўбачыў свет другі выпуск.**




Справакавалі нараджэнне гэтага выдання «Узвышаўскія чытанні», якія праводзяцца БДАМЛіМам ужо не першае дзесяцігоддзе. І тое, што ў апошнія гады матэрыялы чытанняў не выдаваліся зборнікам. Так склаўся — з разлікам на выпраўленне сітуацыі — першы выпуск «Аўтографа». Так і другі выпуск «... за некаторым выключэннем, змяшчае дасланыя ў рабочую групу канферэнцый даклады ўдзельнікаў XI — XX «Узвышаўскіх чытанняў» і IX — XVIII «Архіўных чытанняў». Зборнік мае два раздзелы, кожны з якіх пабудаваны па храналогіі правядзення канферэнцый. На вялікі жаль, дадзены выпуск не змог увабраць усе тэксты. Пры адборы матэрыялаў рэдакцыйная калегія кіравалася некалькімі крытэрыямі: ступенню адпаведнасці тэмы задачам канферэнцыі, фактамі апублікаванасці тэкстаў у іншых зборніках і перыядычных выданнях і інш.». (З прадмовы аўтара праекта і ўкладальніка Ганны Запартыкі)

Ужо ў самым пачатку другога выпуску «Аўтографа» чытача чакае сустрэча з надзвычай важным артыкулам кандыдата філалагічных навук Віктара Жыбуля — «Узвышша» — «Уздальле» — «Узнікжа»: вобразная сімволіка ўзвышэнскай філасофска-эстэтычнай канцэпцыі», у якім даследчык вытлумачвае месца і ролю самога «ўзвышэнскага» руху ў беларускай літаратуры (у беларускай літаратуры на ўсе часіны!). «Стваравая групай беларускіх пісьменнікаў у сярэдзіне 1920-х гадоў філасофска-эстэтычная канцэпцыя ўзвышэнства/аквітызму стала неад'емнай часткай іх светаадчування і творчага светапогляду і мела свой працяг у пазнейшы час, калі пісьменнікі-ўзвышэнцы былі рэпрэсіраваны і апынуліся ў высылцы. Імкненне працаваць і там на карысць роднай культуры падштурхнула іх пераасэнсаваць узвышэнскую тэорыю, адаптаваўшы яе да неспрыяльных для паўнавартаснай літаратурнай дзейнасці ўмоў выгнання». (Віктар Жыбуль).

На старонках другога выпуску «Аўтографа» — сустрэчы з грунтоўнымі даследаваннямі, адкрыцці новага і раней невядомага ў работах Валерыя Назарава («Тлумачэнне рэалій у аўтарскім тэксце (на прыкладзе твораў А. Мрыя)»), Наталлі Сяргеенкі, Віктара Жыбуля («Паэт Аляксандр Сімакоў: полацкі перыяд жыцця і творчасці (1925 — 1928)»), Вольгі Шаталавай («Жыццё ў перыяд «Вялікай Паўзы»: Уладзімір Дубоўка ў 1930 — 1957 гг.»), Жанны Капусты («Запаветы Міхася Мялешкі»), Ігара Шаладонава («Сімволіка вобразнай сістэмы рамана «Пустадомкі» Лукаша Калюгі»), Вячаслава Рагойшы («Пабрацімства двух Уладзіміраў: Уладзімір Караткевіч і Уладзімір Лучук (з дадаткам невядомых лістоў У. Караткевіча)»), Юрася Бачышчы («Творчыя і сваяцкія повязі Уладзіміра Караткевіча і Геральда Асвяцінскага»), Васіліны Міцкевіч, Алеся Петухова («Іван Кліндухоў — «кліент» Якуба Коласа») і іншых.

Выдадзены накладам у 60 экземпляраў, другі выпуск «Аўтографа», несумненна, патрабуе шырокага рэцэнзавання ў беларускім друку, у сацыяльных масмедыя, а таксама прэзентацый у аўдыторыях, дзе яго з'яўленне на свет павінны ведаць — на філалагічных факультэтах, у бібліятэчных асяродках, акадэмічных цэнтрах. Уведзеныя ва ўжытак гісторыка-літаратурныя, гісторыка-культурныя здабыткі, вядома ж, не павінны згубіцца.

**Мікола МІРШЧЫНА.**

Захаваныя каштоўнасці

# Скарбы айца Кірыла

**Настаяцель хоцімскага Свята-Траецкага сабора папоўніў нацыянальную культурную спадчыну ўнікальнымі прадметамі царкоўнага прызначэння.**

Архімандрыт Кірыл (Бадзіч) для Хоцімска, лічы, анёл-ахоўнік. Як прыехаў сюды ў 1958 годзе ў якасці настаяцеля мясцовага храма, так і да пачатку гэтага года працаваў. Дзякуючы яму нанова адбудаваны сабор Святой Тройцы — гістарычна-культурная каштоўнасць другой паловы XIX стагоддзя, узведзены іншыя царкоўныя пабудовы, у тым ліку нядзельная школа для дзяцей. Ён жа ініцыятар тутэйшага фестывалю звону, стваральнік кнігі ўдзельнікаў войнаў — у ёй ім сабраны і пазначаны прозвішчы больш чым 11 тысяч ураджэнцаў раёна. 25 чэрвеня бацюшку споўнілася 95 гадоў, здароўе не дазваляе яму служыць Богу так, як ён гэта рабіў раней. На гэтым пасту яго змяніў новы настаяцель — айцец Павел. У сабора новы гаспадар, а тыя рарытэты, якія Кірыл (Бадзіч) збіраў усё сваё жыццё (у тым ліку і каштоўныя падарункі) і пра якія ён неадназначна расказваў журналістам («Звязда» двойчы пісала пра ўнікальнага бацюшку і яго калекцыі), прызнаныя рэдкімі і значнымі для Беларусі. Менавіта дзякуючы бацюшку захаваліся ўнікальныя дарэвалюцыйныя іконы, рызы, кнігі, за якія ў савецкі час можна было атрымаць пакаранне. Сёння некаторыя з іх амаль музейнай каштоўнасці. Бацюшка ведае ім цану і сам паклапаціўся, каб усё гэта зберагчы для краіны і роднага сабора.

— Са згоды архімандрыта Кірыла пракуратура Хоцімскага раёна накіравала ў райвыканкам інфармацыю з прапановай разгледзець пытанне аб магчымасці надзялення каштоўных прадметаў спецыяльным прававым статусам і папаўнення імі нацыянальнай культурнай спадчыны, стварэння прававых гарантый па папярэджанні страты гэтых рэчаў, іх крадзяжу, а таксама для стварэння глебы для паломніцкага турызму, — паведаміла **старшы памочнік пракурора Магілёўскай вобласці па прававым забеспячэнні, інфармацыі і грамадскіх сувязях Алена ШУМЕЙКА.** — Было ўстаноўлена, што ў Свята-Траецкім саборы сапраўды знаходзяцца матэрыяльныя каштоўнасці, некаторым з якіх больш чым 300 гадоў. Рэчы ўяўляюць значнасць з пункту гледжання гісторыі, мастацтва і культуры.



Сярод рарытэтаў — камплекты адзення праваслаўнага служыцеля канца XVIII — пачатку XX стагоддзяў, іконы XIX стагоддзя з разнымі ківотамі і пазалотай, царкоўнае начынне з каштоўных металаў і кнігі XIX стагоддзя — усяго 260 прадметаў.

Па даручэнні пракуратуры галоўнае ўпраўленне культуры Магілёўскага аблвыканкама правяло работу па падрыхтоўцы прапановы аб наданні гэтым прадметам статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Нядаўна на пасяджэнні Магілёўскага абласнога савета па пытаннях ахову гісторыка-культурнай спадчыны было прынята рашэнне прысвоіць царкоўным рарытэтам статус гісторыка-культурнай каштоўнасці трэцяй катэгорыі.

— Прапанову аб наданні статусу рыхтаваў Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Раманава, — удакладніў **галоўны спецыяліст упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Яўген БЕЛАВУСАЎ.** — Музейныя эксперты выязджалі ў Хоцімск, вывучалі, фатаграфавалі, апісвалі гэтыя прадметы, і іх каштоўнасць пацвердзілася. Усе яны знаходзяцца ў храме і нікуды вынасіцца не будуць. Уласнікам з'яўляецца епархія і хоцімскі сабор Святой Тройцы. Яны будуць знаходзіцца ў прыходзе і задзейнічаны ў богаслужэнні. Гэта рухомая гісторыка-культурная каштоўнасць і на яе распрацаваны пашпарт, падпісана ахоўнае абавязацельства.

— Дадзеная калекцыя сапраўды ўнікальная, айцец Кірыл збіраў гэтыя прадметы ўсё жыццё, у тым ліку прывозіў з Расіі, — кажа **намеснік старшыні Хоцімскага райвыканкама Мікалай ХУЧАЎ.** — Цяпер гэта гісторыка-культурная каштоўнасць і яе нельга будзе перамяшчаць за межы Беларусі. Кірыл Бадзіч — прыклад для пераймання, такіх, як ён, цяжка знайсці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** | |
| **Продавец** | **ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл, Дзержинский р-н, Фанипольский, с/с 19** | |
| **Предмет аукциона** | | |
| Лот, № | Наименование | Начальная цена с НДС 20 % |
| 1 | **Административно-хозяйственное здание с пристройкой** (общ. пл. 895,2 кв. м, инвент. номер 500/С-2686, по адресу: **г. Минск, ул. Короля, 34)** | **2 442 269,90** бел. руб. (снижена на 10 %) |
| **В состав лота входит иное имущество, размещенное на сайте организатора торгов www.cpo.by** | | |
